САКРЭТЫ ТЭАТРА АДНАГО АКЦЁРА 10

ДЗІКАРОСЛЫЯ РАСЛІНЫ Ў ХАРЧАВАННІ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

23 КРАСАВІКА 2022 г. СУБОТА

№ 79 (29701)

ЗВЯЗДА

Вясна на зямлі. Вясна ў душах

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Хрыстовым Уваскрэсеннем.

Свята Вялікадня для кожнага з нас непадзельна звязана з трыумфам жыцця і велічу самаахвяравання Хрыста, яго бескарыслівым служэннем людзям.

У гэтыя дні сэрца кожнага верніка замірае ў чаканні добрай весткі і цуда ўваскрэсення Хрыстова, дзякуючы якому ў душы з новай сілай абуджаюцца любоў і дабро, вера і міласэрнасць, імкненне да стварэння і дапамогі блізкаму.

Няхай радасць светлага свята захоўвае ў нашых дамах цяпло, мір і спакой, умацуе ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, любові і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Анатоля КЛЕЦКАГА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КАЛІ РУХНЕ ЭКАНОМІКА, НІКОМУ НІЯКІ КУРС НЕ ПАТРЭБНЫ БУДЗЕ, НІ ІНФЛЯЦЫЯ, НІ ДЫФЛЯЦЫЯ»

Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў бюджэтную палітыку са старшынёй КДК Васілём Герасімавым, кіраўніком Нацбанка Пятром Калаурам, першым віцэ-прэм'ерам Мікалаем Снапковым, намеснікам кіраўніка сваёй Адміністрацыі Дзмітрыем Крутым і міністрам фінансаў Юрыем Селівёрставым.

Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з адказнымі за фінансавую сістэму краіны заявіў, што на першым месцы ў чыноўнікаў павінна быць эканоміка, а толькі потым звязаныя з ёй пытанні — інфляцыя і курс нацвалюты. «Я спецыяльна запрасіў старшыню Нацыянальнага банка для таго, каб прысутныя тут (а вы ў асноўным займаецеся эканамічна-фінансавымі пытаннямі ў нашай краіне) разумелі, што эканоміка перадусім. Потым усе пытанні: курс, інфляцыя. Гэта важна — і курс нацыянальнай валюты, і суадносіны курсу нашай нацыянальнай валюты з іншымі нацыянальнымі валютамі. Вельмі важная і інфляцыя, якая выліваецца ў рост цэн, і дыфляцыя, таксама не дай божа. Але галоўнае — эканоміка. Калі рухне эканоміка, нікому ніякі курс не патрэбны будзе, ні інфляцыя, ні дыфляцыя», — сказаў кіраўнік краіны.

Паводле яго, «бюджэт — паказчык функцыянавання эканомікі і ўвогуле стану спраў у дзяржаве», таму ён папрасіў паведаміць, якія меры прыняты ўрадам па кансалідацыі бюджэту.

«Думаю, людзям СМІ растлумачаць, што гэта такое. Калі перакладаць на зразумелую мову: што мы зрабілі, каб развіваўся рэальны сектар эканомікі і ў выніку ўсіх нашых мер, наколькі збалансаваны быў бы бюджэт», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Другое пытанне нарады — ацэнка паступленняў у бюджэт, даходы бюджэту ў сувязі з мерамі, што прымаюцца ва ўмовах ціску на эканоміку і крэдытна-фінансавую сістэму краіны. З гэтай нагоды Прэзідэнт запытаў, які магчымы дэфіцыт нашага бюджэту ў гэтым годзе і за кошт чаго мы будзем пакрываць яго?

«І самае галоўнае, дзеля чаго мы ўсё тут абмяркоўваем і радзімся, дзеля чаго гэта балансаванне бюджэту — дзеля людзей. А гэта заробкі, зона адказнасці бюджэту — бюджэтнікі і, зразумела, пенсіянеры. Як гэта ўплывае на рэальны сектар эканомікі, працоўныя калектывы, на заработную плату нашых людзей? Бюджэт, як люстэрка, высвечвае ўсе нашы праблемы і станоўчыя бакі», — заўважыў Прэзідэнт. СТАР. 2

ДЫСЦЫПЛІНА — ПА-НАД УСІМ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Наваполацкага гарвыканкама па пытанні «Аб стане вытворчага траўматызму, прамысловай дысцыпліны ў арганізацыях горада Наваполацка, выкананні патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта нумар 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны», паведамляе БелТА.

Фота БелТА.

«Сёння на пасяджэнні Наваполацкага гарвыканкама разглядалася пытанне выканання патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта нумар 1. Гэта пытанне, якое прадугледжвае кантроль за выкананнем у гарадах і раёнах дысцыпліны, правапарадку, знаходзіцца на пастаянным кантролі дзяржаўных органаў улады і кіравання. На пасяджэннях выканкама яно разглядаецца даволі часта. У 2021 годзе пяць разоў на пасяджэннях Наваполацкага гарвыканкама разглядалі выкананне Дырэктывы нумар 1, — расказала Наталля Качанава. — Статыстыка, якая была агучана сёння, — пацяржданне таму, што гэта работа дае вынікі».

На думку спікера, у такой рабоце павінны быць задзейнічаны ўсе зацікаўленыя: кіраўнікі прадпрыемстваў, мясцовых органаў улады, грамадскія арганізацыі. «Важна, што сёння ёсць такая зладжаная работа, у тым ліку грамадскіх арганізацый, па ўмацаванні грамадскай дысцыпліны. Лічбы і статыстыка, ды і само жыццё гэта паказваюць. Самазаспакойвацца нам нельга. Ёсць пытанні, якім трэба даваць сур'ёзную ацэнку», — адзначыла яна. Наталля Качанава дадала: на пасяджэнні гарвыканкама ўвагу ўдзялілі і занятасці гараджан.

«Гэтымі пытаннямі трэба займацца комплексна і ўсім разам», — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

ВАСЯМНАЦЦАЦЬ СПОЎНІЛАСЯ Ў САКАВІКУ 1945-ГА

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны ў мірны час стаў найлепшым калгасным працаўніком і ўзорным гаспадаром

Калі б яму хто ў дзяцінстве ці юнацтве, на якія выпалі сапраўдныя выпрабаванні, сказаў, што пражыве доўгае жыццё, ды на сваіх нагах, пры добрай памяці адзначыць 95-гадовы юбілей, мусіць, не паверыў бы. Пра гэта не раз падчас размовы скажа ветэран. Але лёс распарадзіўся вось так, а не інакш. Можа, яшчэ і таму, што Павел Данілавіч заўсёды быў рухавым, працавітым, здольным да засваення новага. Пра такіх кажуць: на ўсе рукі майстар. А яшчэ ў песні ёсць словы акурат пра іх — тых, каго старасць дома не застане.

Дзяцінства, вайна, акупацыя

Павел Макарэвіч жыве ў Хомску, а нарадзіўся ў суседняй вёсачцы Зазяленне ў сакавіку 1927 года. Калі хлопчыку было два гады, памёр бацька. Маці, зусім маладая жанчына, засталася з трыма дзецьмі, з якіх старэйшаму — шэсць, малодшай дачцэ — усяго 14 тыдняў. Вось так і гаравала на сваёй гаспадарцы з малымі на руках. І ўжо ў 10 гадоў Павел сам пачаў араць, для гэтага яму нават зрабілі маленькі плуг, і касіў усё такой жа адмысловай касой. СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Інфляцыя ў ЕС можа знішчыць еўра

Еўрапейскі саюз чакае працяглая інфляцыя, якая здольная знішчыць еўра. Пра гэта ў інтэрв'ю нямецкаму выданню Deutsche Wirtschafts Nachrichten заявіў колішні галоўны эканаміст Deutsche Bank Томас Маер, паведаміла RT. Па словах эканаміста, еўрапейская валюта становіцца ўсё больш няўстойлівай. Пры гэтым Еўрапейскі цэнтральны банк нічога не робіць, каб паўплываць на сітуацыю, а толькі працягвае друкаваць банкноты. Томас Маер лічыць, што інфляцыя ў краінах ЕС будзе мець не толькі эканамічныя, але і палітычныя, а таксама сацыяльныя наступствы. Раней паведамлялася, што ў сакавіку інфляцыя ў краінах еўразоны дасягнула 7,5 працэнта, пабіўшы гістарычны рэкорд. Як адзначыў Euronews, такі стан спраў выклікаў масавую незадаволенасць грамадзян. Хваля пратэстаў пракацілася па шэрагу еўрапейскіх краін і, паводле прагнозаў экспертаў, наўрад ці сціхне найбліжэйшым часам.

Дэпутат бундэстага: з дапамогай санкцый ЗША ліквідуюць з рынку моцныя канкурэнтаў

Як заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» дэпутат бундэстага 19-га склікання (Германія) Вальдэмар Герт, палітыка Вашынгтона адносна Берліна цалкам відавочная: яны ліквідуюць моцнага канкурэнта. Палітык канстатаваў: адбываецца беспрэцэдэнтны ціск, каб пазбавіць нямецкую індустрыю таннага энерганосьбіта. «Тым самым скінуць з канкурэнтнай пляцоўкі такога магутнага гульца, як хімічная індустрыя краіны, таму што яна не вытрымлівае і не вытрымае канкурэнцыі пры такой цане на газ, — адзначыў ён. — Услед за хімічнай індустрыяй упадзе на калені аўтамабільная, таму што пластык і ўсё астатняе таксама стануць нерэнтабельнымі. І ўсе гэтыя нішы, вядома ж, спрабуе заняць і будзе займаць амерыканскі бізнес. Так што нічога асабістага: бізнес ёсць бізнес. У той час як нам забараняюць «Паўночны струмень», Амерыка павялічвае закупкі нафты ў Расіі».

У Еўропе выяўлены выпадкі вострага гепатыту невядомага паходжання ў дзяцей

Захворванне дыягнаставана ў дзяцей рознага ўзросту, паведамілі Euronews. Адзначаецца, што ў Вялікабрытаніі хвароба закранула 74 дзіцяці ва ўзросце ад двух да пяці гадоў. У некаторых была нават вострая пячоначная недастатковасць, і «невялікай колькасці дзяцей спатрэбілася трансплантацыя печані». Эксперты ў галіне аховы здароўя краіны спрабуюць вызначыць прычыны захворвання, бо звычайныя вірусы, якія выклікаюць хваробу, не знойдзены. Еўрапейскі цэнтр прафілактыкі і кантролю захворванняў (ECDC) паведаміў, што новыя выпадкі гепатыту невядомага паходжання былі зарэгістраваны ў Даніі, Ірландыі, Нідэрландах і Іспаніі. Таксама было зафіксавана дзевяць выпадкаў у дзяцей ва ўзросце ад аднаго да шасці гадоў у штаце Алабама ў ЗША. Сусветная арганізацыя аховы здароўя і агенцтва аховы здароўя ЕС папярэдзілі іншыя краіны, каб яны паведамлялі аб любых выпадках захворвання.

КАРОТКА

- **Выплата матдапамогі ветэранам да Дня Перамогі пачнецца з 25 красавіка.**
- Другі нацыянальны форум атлетаў пройдзе ў штаб-кватэры НАК 28 красавіка.
- **Беларусь і «Расатам» распрацуюць дарожную карту ў галіне абыходжання з радыеактыўнымі адходамі.**
- БДУ прадставіць больш за 20 распрацовак на міжнароднай прамысловай выстаўцы ў Ташкенце.
- **Аўтапрабег у памяць аб чарнобыльскай катастрофе правядуць у Гомельскай вобласці. Кропкамі старту стануць Карма і Ельск. Адзін з маршрутаў пройдзе праз Чачэрск і Ветку, другі — праз Нароўлю і Хойнікі.**
- Міліцыя Мінскай вобласці на Вялікдзень будзе дзяжурыць ва ўзмоцненым рэжыме.

Уласная фінансы

КУДЫ ЎКЛАСЦІ СВАБОДНЫЯ ГРОШЫ

Тры правілы «банкіра-пачаткоўца»

Ёсць тры правілы планавання сямейнага бюджэту. Першае правіла гучыць так — «Заплаціце спачатку сабе». Справа ў тым, што фінансісты рэкамендуюць мінімум 10 % ад штомесячнага даходу адкласці і не марнаваць іх ні пры якіх абставінах. Пажадана адразу ж адкладаць гэтыя грошы ў банк на бездатэрміновы ўпэўненасць у будучыні.

Другое правіла заключаецца ў захаванні прыярытэтнасці выдаткаў. Трэба вызначыць, што для сям'і з'яўляецца важным, а што — другарадным. Тут неабходна размеркаваць грошы спачатку на важныя і тэрміновыя выдаткі, а ўжо тое, што застанецца, — на няважныя і нетэрміновыя. Парадак дзеянняў наступны. Складаем спіс важнасці выдаткаў.

- Грошы на рэгулярныя і абавязковыя выдаткі неабходна адразу адкласці асобна.
- Адкладаем 5—10 % ад даходу на непрадбачаныя выдаткі.
- У іншы стос адкладваем грошы на плануемыя выдаткі.
- Лічым рэшту. Размяркоўваем на нетэрміновыя і неабавязковыя выдаткі.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

«КАЛІ РУХНЕ ЭКАНОМІКА, НІКОМУ НІЯКІ КУРС НЕ ПАТРЭБНЫ БУДЗЕ, НІ ІНФЛЯЦЫЯ, НІ ДЫФЛЯЦЫЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што заўсёды былі супярэчнасці паміж Нацыянальным банкам і ўрадам. «Тым не менш неабходна знайсці складнік, каб не пакутавала эканоміка і рабіць усё, каб эканоміка працавала. Тады будзе і курс і не будзе інфляцыі», — паведаміў кіраўнік краіны.

Ён таксама падзяліўся, што здзівіўся і абрадаваўся: за першы квартал бюджэт крыху больш за працэнт дадаў. «Але гэта не значыць, што мы павінны расслабляцца, таму што супраць нас будуць пастаянна ўзмацняць ціск», — завяршыў кіраўнік краіны.

Асноўны дакладчык, міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў, адзначыў, што за першы квартал з бюджэтам спрацавалі ў межах запланаваных параметраў. У даходы паступіла 6,7 мільярда рублёў. Гэта на 1,1 мільярда рублёў больш, чым

Фота Белта.

за аналагічны перыяд летась. «Па расходах на першы квартал прафінансавана 6 мільярдаў рублёў. Калі выключыць разавае рашэнне па падтрымцы ў мінулым годзе БМЗ, расходы рэспубліканскага бюджэту ў цэлым супастаўныя з узроўнем мінулага года. Прыярытэты: даходы насельніцтва, фінансаванне нацыянальнай абароны і бяспекі, набыццё медыкаментаў, падтрымка аграпрамысловага комплексу. Прафіцыт за першы квартал склаў 662 мільёны рублёў», — паведаміў міністр.

Каментарый у тэму

Міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ расказаў, што кансалідацыя бюджэту — тэрмін, які простымі словамі прадугледжвае максімальнае збіранне ўсіх сродкаў у адзін «кулак». То-бок, аб'яднаць максімальна даходы на пастаўленыя мэты і адмовіцца ад нейкіх расходаў, максімальна аптымізаваць.

«Аптымізацыя расходаў — стандартная з'ява для бюджэтаў усіх узроўняў і ва ўсіх краінах, таму што прасцей імкнуцца атрымаць з бюджэту бясплатныя грошы і накіраваць іх на рашэнне сваіх задач. Але гэтыя рэсурсы трапляюць у бюджэт не проста, а зарабляюцца. Зарабляюцца няпроста апошнім часам. Узяць і патраціць на тое, што ты хочаш, — не наш выбраны, — заявіў кіраўнік фінансавага ведамства. — Натуральна, патрэбна аптымізацыя. Пра гэта Прэзідэнт і казаў. Кансалідацыя — адмовіцца ад залішняга, сабраць максімальна ў бюджэт усе даходы, пагляджэць рэсурсы, якія неэфектыўна працуюць, і іх прыцягнуць у бюджэт, накіраваць на пэўныя мэты».

Міністр расказаў, што па выніках першага квартала назіраецца прафіцыт бюджэту ў памеры больш за 600 мільёнаў рублёў. Але далей спадзявацца на такую нагоду не прыходзіцца.

«У студзені яшчэ былі паступленні за мінулы год, калі не было ўзрушэнняў, узмацнення санкцыйнага ціску. Тым не менш выйсці добры. Усе расходы, у тым ліку сацыяльныя, аплачаныя. Прынятае рашэнне аб хоць і невялікім, але павелічэнні заработнай платы бюджэтнікам. Падняты пенсіі», — сказаў Юрый Селівёрстаў.

У прынцыпе, дадае ён, бюджэт выконваецца стабільна, але ёсць выклікі, з якімі неабходна працаваць. Пры гэтым усе сацыяльныя абавязкі дзяржавы будуць выкананы, запэўніў суразмоўца.

Міністр расказаў, якія расходы ў сённяшняй сітуацыі будуць скарочаны. У першую чаргу, на капітальныя рамонты.

«Зразумела, што любы гаспадар хоча нешта ўдасканаліць у сябе на вытворчасці, дома, на сваім аб'екце. Зараз не зусім той час, калі неабходна гэта рабіць. Нехта хацеў набыць нейкае абсталяванне, ад яго таксама варта адмовіцца. Расходы, што звязаны з набыццём медыцынскага абсталявання, рэчамі, якія неабходны для функцыянавання бюджэтных аб'ектаў, будуць прафінансаваныя», — акцэнтаваў Юрый Селівёрстаў.

Першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ падкрэсліў, што патрабаванне кіраўніка краіны адносна бюджэту адно — захаваць выплаты насельніцтву.

«Пры ўсіх цяжкасцях, пры ўсёй няпростасці сітуацыі ўрад павінен перадусім звяртаць увагу на чалавека. Эканоміка не дзеля эканомікі, эканоміка дзеля чалавека. Гэта датычыцца і бюджэтнай сферы, бо гэта паслугі. Паслугі — гэта людзі. Людзі павінны атрымліваць заробленую плату, сацыяльную дапамогу і пенсіі. Гэта, безумоўна тое, што павінен забяспечваць урад, нягледзячы на цяжкасці з-за санкцыйнага ціску», — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

Першы віцэ-прэм'ер расказаў, што прагноз інфляцыі не будзе апублікаваны і ўявіць яе памер складана: «Усё залежыць не ад унутранай сітуацыі. Унутраную сітуацыю і цэны для спажыўцоў урад актыўна стрымлівае. Інфляцыя ў блізкіх краінах вышэйшая, перадусім спажывецкая інфляцыя. Таму ўся інфляцыя, якую маем зараз, — знешняя — з-за дэвальвацыі расійскага рубля і росту сусветных цэн на харчаванне. Таму складана спрагназаваць яе ўнутры краіны».

Марыя ДАДАЛКА.

З нагоды

АДНЫМ ШЛЯХАМ

Як развіваецца медыйнае супрацоўніцтва Беларусі і Кітая?

Узаемадзеянне Беларусі і Кітая дынамічна развіваецца на працягу больш чым трох дзесяцігоддзяў. Сёлета нашы краіны адзначылі адметную дату — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. За гэты адносна невялікі прамежак часу кранам удалося здзейсніць сапраўдны прарыў — беларуска-кітайскае ўзаемадзеянне на міжнародай арэне шмат у чым прызнаецца ўзорным. «Мінск ганарыцца адносінамі жалезнага братэрства і ўсёпагоднага сяброўства з Пекінам», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім віншаванні Старшыні КНР Сі Цзіньпіну з нагоды Свята Вясны. Вынікам плённага ўзаемадзеяння сталі маштабныя праекты, адзін з ключавых — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», які кіраўнік КНР па праве назваў жамчужынай транснацыянальнага праекта «Пояс і шлях». У пачатку наступнага тыдня адбудзецца насамрэч знакавая падзея ў беларуска-кітайскай медыйнай прасторы — журналісцкія супольнасці нашых краін падпішуць пагадненне аб супрацоўніцтве. Што дасць дакумент, чым увогуле адметнае ўзаемадзеянне ў гэтай сферы, «Звязда» расказаў старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЎ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Чаму ўзнікла неабходнасць у падпісанні пагадненняў?

— Сувязі паміж журналісцкімі супольнасцямі Беларусі і Кітая не перапыняліся. Яны былі шчыльныя і ў савецкі час, і падчас устанаўлення дыпламатычных адносін у 1992 годзе. Беларусь уяўляла інтарэс для Кітая, а Пекін быў надзвычай цікавы для Мінска, паколькі пашыралася супрацоўніцтва па шырокім дыяпазоне сфер. Апошнія 10 гадоў гэтае ўзаемадзеянне выйшла на новы ўзровень. Беларускім саюзам журналістаў у 2015 годзе было падпісана пагадненне з Усекітайскай асацыяцыяй журналістаў. Адпаведныя пагадненні былі заключаны паміж СМІ Беларусі і Кітая. Адбываецца рэгулярны абмен дэлегацыямі. Праўда, свае карэктывы ўнесла пандэмія каранавіруса, паколькі многія кантакты перайшлі ў анлайн-фармат.

Гэта з аднаго боку, а з іншага — журналістаў стымулюе рухацца далей дынаміка ўзаемаадносін: паспяховая рэалізацыя вышэйпаказаных глабальных эканамічных праектаў, у прыватнасці кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Такое супрацоўніцтва патрабуе ў інфармацыйны век належнага суправаджэння. Адсюль узнікла ідэя падпісаць вялікае пагадненне, дзе б мы акрэслілі дынамічнае двухбаковае супрацоўніцтва і абмен кантэнтам. Мы імкнуліся прапісаць шэраг важных момантаў: гэта і навучанне маладых калег, і ўдасканаленне кваліфікацыі, і абмен візітамі.

З іншага боку, нам неабходна падтрымліваць адзін аднаго на міжнародай арэне. Пакольку зараз самыя аўтарытэтныя журналісцкія арганізацыі, такія як Міжнародная федэрацыя журналістаў, Еўрапейская федэрацыя журналістаў, розныя таксама так бегчы ды сядзець там розны час. Так і жылі да самага вызвалення».

звяныя праваабарончыя цэнтры актыўна прасоўваюць сінафобію і фэйкі ад Кітаі. Былі шматлікія спробы прасоўвання сінафобіі ў Беларусі праз так званыя новыя медыя. У прыватнасці, прасоўваўся фэйк аб кітайскім паходжанні каранавіруса. Тут мы падстаўляем плячо нашым калегам з Паднябеснай. Даносім аб'ектыўную інфармацыю і развенчваем фэйкі, якія скіраваны на тое, каб спарадзіць страхі перад усім кітайскім, падараваць шчыльнае палітычнае, эканамічнае, гуманітарнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

— Чым адметнае медыйнае супрацоўніцтва падчас пандэміі?

— З-за пандэміі каранавіруса, калі журналісцкае супрацоўніцтва шмат у чым было згорнута, мы нарошчвалі ўзаемадзеянне анлайн праз развіццё клубнай практыкі. Стварылі клуб журналістаў і экспертаў дзвюх краін «Бяньчжун» («Звон»). З беларускага боку яго ўзначальвае Юрый Шаўцоў. Вельмі важна стварэнне такіх пляцовак, якія б, па-першае, фармулявалі на экспертным узроўні задачы, што стаяць перад журналісцкімі арганізацыямі, па-другое, праводзілі б даследаванні, акумулявалі аналітычную работу. У тым ліку вельмі важныя сацыялагічныя апытанні наконт таго, якія кірункі нашага супрацоўніцтва найменш ахоплены інфармацыйнай падтрымкай. Бо зараз, калі нейкая падзея недастаткова раскручана ў медыйным полі, пэўныя структуры прыцягваюць інфармацыйных шарлатанаў, стварваюць фэйкі, правакацыі.

Мы праводзілі летась спецыяльнае даследаванне аб тым, наколькі кітайская тэматыка прысутнічае ў беларускіх СМІ. Прычым вывучалі не толькі прастору распаўсюджвання, але і рэгіянальных, а таксама так званых новых медыя — апытвалі блогераў, цік-токераў, інфлюэнсераў, лідараў грамадскага меркавання як у сталіцы, так і ў рэгіёнах. Даследаванне паказала, што кітайская тэматыка прысутнічае на ўсёй прасторы, двухбаковае супрацоўніцтва нязменна выклікае цікавасць і вельмі пазітыўна ўспрымаецца. Аднак адчуваецца перакос у бок буйных распаўсюджвальнікаў СМІ. Менавіта яны трымаюць гэты парадак дня, задаюць асноўныя тэнды асвятлення тых ці іншых падзей, напрыклад, сумеснага пераадолення наступстваў пандэміі, сустрэч на найвышэйшым узроўні, святкавання 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін.

У рэгіёнах супрацоўніцтва менш актыўнае. Таксама дастаткова сціпла адбываецца абмен відэакантэнтам і распаўсюджванне беларускай пазіцыі ў новыя медыя Кітая. Тут прычыны і аб'ектыўныя, і суб'ектыўныя, паколькі носьбітаў кітайскай культуры і мовы ў Беларусі не так шмат. Цяпер поле кітаязнаўцаў, усходазнаўцаў значна нарошчваецца, аднак іх няшмат. Плюс многія медыя, асцерагаючыся памыліцца, абмяжоўваюць сябе ў такіх выказваннях, публікацыях, выступленнях. Атрымліваецца, што кітайская тэматыка ў беларускай інфармацыйнай прасторы, а беларускага ў кітайскай, на жаль, перыядычная — ад выпадку да выпадку. На наш погляд, у рамках новага пагаднення, якое мы падпішам, варта гэтую работу, асабліва ў вымярэнні медыя, журналістыкі, публіцыстыкі, выводзіць на такі ж сістэмны ўзровень, на якім знаходзяцца палітычныя, эканамічныя адносіны.

Адметна, што з боку Усекітайскай асацыяцыі журналістаў, якая аб'яднюе больш чым мільён прафесійных журналістаў, такая цікавасць ёсць. Яскравы прыклад: агенцтва «Мінск-Навіны» арганізавала абмен медыякантэнтам з УАЖ па адчувальных знешнепалітычных тэмах (у прыватнасці, эксклюзіўнае інтэрв'ю з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем для Цэнтральнага тэлебачання Кітая). Шмат у чым гэта прарывае тую інфармацыйную блакаду, якую імкнуцца выставіць супраць нас заходнееўрапейскія партнёры. Кітайскія медыя на англійскай мове працыталаві інтэрв'ю, і яно такім чынам трапіла на сусветныя навінавыя пляцоўкі. Для нас гэта добрая магчымасць даносіць нашы каментарыі, пазіцыю, аналітыку не толькі да кітайцаў, але і да ўсяго свету.

— У Паднябеснай нам ёсць чаму павучыцца?

— Кітай актыўна развівае прысутнасць новых медыя. З'яўляецца пляцоўкай, платформай для стварэння новых камунікатараў, месенджараў, хостынгу, відэакантэнту, таму ў гэтым сэнсе беларускім журналістам надзвычай цікавы. Нас аб'ядноўвае і тое, што ў Беларусі і ў Кітаі класічныя СМІ карыстаюцца вялікай папулярнасцю і актыўна развіваюцца адпаведны сегмент. Такі падыход абгрунтаваны, паколькі мы не ведаем, што з'яўляецца ўласнікам, а часта і мадэратарам той ці іншай платформы ў інтэрнэце. Мы бачым, што сучасныя камунікатары, створаныя ў тым ліку ў США, уводзяць залімітавы ўзровень цэнзуры, у тым ліку для расійскіх, беларускіх СМІ. Таму ўзнікае неабходнасць стварэць (такія ідэі ўжо ёсць) аб'ектыўную еўразійскую медыяпрастору. Мы з задавальненнем развіваем такое супрацоўніцтва. Падключаем саюзы журналістаў, медыяньясы Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Азербайджана, Арменіі, то-бок, усёй адпаведнай прасторы. Разлічваем, што і нашы ўкраінскія калегі таксама далучацца да гэтай работы. Мы адпрацоўваем такую магчымасць.

Вельмі важна развіваць медыясупрацоўніцтва на маштабнай платформе «Адзін пояс, адзін шлях», куды прыцягнута большасць краін свету, якія падзяляюць цывілізаваны, далікатны падыход з боку Кітая да сваіх партнёраў у геапалітычным кантэксце. Мы таксама частка гэтага глабальнага журналісцкага вымярэння. Агучвалі неабходнасць фарміраваць тут свою платформу і новых медыя, і непасрэдны камунікацыі. Так што мы рушым адным шляхам і вялікія развіваем канструктыўнае супрацоўніцтва на карысць не разбуральнай, а стваральнай журналістыкі.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ЗАЎСЁДЫ РАДУЙЦЕСЯ

Узлюбленыя ў Хрысце архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя сыны і дочкі Беларускай Праваслаўнай Царквы!

ХРЫСТОС ВАСКРОС!

Зноў разліваецца над зямлёй Пасхальны звон, храмы напоўнены людзьмі, якія ў вялікай радасці вітаюць адзін аднаго ўзнёсламі святочнымі словамі: «Хрыстос васкрос!»

Зусім нядаўна мы духоўна справажалі Госпада на Галгофу, смуткавалі разам з Маці Божай, святымі апосталамі і жанчынамі-міраносіцамі, супакойваючы пакутам Спасіцеля, пераносячы са слязьмі прачыстае цела ў магільную пячору. Разам з прарокам Ісаіем наша сэрца і розум схіліліся ў глыбокай пашане перад неспасцежным вобразам Госпада Славы, Які скарыў Сябе да смерці на крыжы:

«Ён быў пакрыты ранамі за грахі нашы і пакутаваў за беззаконні нашы; пакаранне міру нашага было на Ім... Як авечку, вялі Яго на смерць, і, як ягня, якое маўчыць перад тым, хто стрыжэ яго, так Ён не адкрываў вуснаў Сваіх» (Іс. 53, 5, 7).

Тыдню пакут папярэднічаў Вялікі пост — час пакаяння, малітвы і духоўнай працы, калі мы з дапамогай Божай намагалісяачысціць сябе ад усяго марнага і грэшнага, каб адкрыць сваё сэрца благадаці Божай.

І вось цяпер, у дзень, які стварыў Гасподзь, мы прыйшлі ў храмы Божыя, каб узрадавацца і ўзвесяліцца ў гэты дзень (Пс. 117, 24), і каб, паводле слоў свяцілен Іаана Залатавуста, «увайсці ў радасць Госпада свайго і атрымаць асалоду ад гэтай цудоўнай і светлай урачыстасці» (Слова абвяшчальнае на Святую Пасху).

Гасподзь наш Ісус Хрыстос паказае, як трэба перажываць радасці і выпрабаванні, якія сустракаюцца на нашым шляху, у чым шукаць суцяшэнне і чэрпаць жыццёвыя сілы. «Мая ежа — выконваць волю Таго, Хто паслаў Мяне і здзейсніць справу Яго» (Ін. 4, 34), — вучыць Сын Божы. Пры гэтым Ён знаходзіцца ў няспынным малітве і сувязі са Сваім Нябесным Айцом.

Менавіта таму на працягу Вялікага посту мы столькі ўвагі і сіл аддавалі малітве дамашняй і царкоўнай. І кожны, хто спазнаў вопыт шчырай і пастаяннай малітвы, пераканаваецца, што чым больш мы схіляем сябе да яе, тым больш, паводле слоў апостала Паўла, здабываем духоўнай радасці: «Заўсёды радуйцеся. Няспынна маліцеся» (1 Фес. 5, 16). І вельмі важна такі настрой нашага сэрца зберагчы ва ўсе астатнія дні года.

У свеце сёння нарастае напружанасць і супрацьстаянне: свет уступіў у эпоху перамен, і гэта ўсё больш трывожыць людзей на зямлі. Але ў нас ёсць вялікае суцяшэнне і трывалы падмурак нашай надзеі, бо хрысціяне маюць унікальную магчымасць ацэньваць усё тое, што адбываецца, з пункту гледжання вечнасці і ў святле той вялікай Пасхальнай перамогі, якую атрымаў Сын Божы і Сын Чалавечы над злом і смерцю. «Вось, Я кладу ў падмурак на Сіёне камень, камень выпрабаваны, краевугольны, каштоўны, добра ўмацаваны: той, хто веруе ў Яго, не будзе пасаромлены» (Іс. 28, 16).

У гэтым годзе мы ўрачыста святкуем 1030-годдзе Праваслаўя на беларускіх землях. Гэта змушае нас асабліва ўважліва звярнуцца да нашага гістарычнага вопыту. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія перажыў наш народ, выхаваўшы ў ім такія хрысціянскія дабрадзейнасці, як любоў да бліжняга, лагоднасць, цярплівасць і міласэрнасць, уменне зразумець адзін аднаго.

Зносіны з Богам, выкананне Яго запаведзяў — вось пуцяводная зорка ў няпростым сучасным свеце. Кіруючыся ёю, мы захаваем нашу сэрца адкрытым для благадаці, а нашы духоўныя вочы будуць ясна бачыць Промысел Божы і знаходзіць адпаведны яму правільны шлях. Пры гэтым, несумненна, будзем мець цвёрдую надзею на ўсёмагутную дапамогу ад Госпада. «А надзея не пасаромбіць, бо любоў Божая вылілася ў сэрцы нашы Духам Святым, Які дадзены нам» (Рым. 5, 5).

Вішую Вас, дарагія, з урачыстасцю Светлай Пасхі! Малітоўна жадаю, каб нашы сэрцы напоўніліся Пасхальнай радасцю і яна асвячала ўсе нашы думкі і ўчынкі. Панясём добрую вестку пра Хрыста Уваскрэслага нашым братам і сёстрам, блізкім і далёкім, асабліва тым, хто знаходзіцца ў смутку і хваробе, каб кожны дакранўўся да той радасці, якую Гасподзь дараваў нам Сваім Уваскрэсеннем.

САПРАЎДЫ ЎВАСКРОС ХРЫСТОС!

Веніямін,
Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,
Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.
Пасха Хрыстова, 2022

горад Мінск.

ВАСЯМНАЦЦАЦЬ СПОЎНІЛАСЯ Ў САКАВІКУ 1945-га

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Тады ж як было, — расказвае ветэран, — што ты вырасцуў, выгадаваў у свайі гаспадарцы, прадаў, гэта і будзе твой дахад, усе жылі са свайго кавалка зямлі. А конік у нас быў не вельмі дужы, на цяжкую работу маці трэба было наняць людзей, заплаціць ім, вось і прыйшлося з такіх гадоў брацца за мужчынскую працу.

Пра маці сваю Павел Данілавіч згадвае з вялікай павагай і любоўю. Гэта асабліва падкрэсліла яго дачка Свяглана Паўлаўна. Бабуля яе памерла даўно, у 1962 годзе, даволі маладой. Усе гады сын клапатліва даглядаў магілу, успамінаў матулю самымі добрымі словамі, шкадаваў, што выпала ёй такая доля. Да пачатку 40-х толькі падраслі дзеці, не выраслі, а менавіта падраслі, каб стаць памочнікамі, як вайна пачалася.

Да вайны Павел скончыў сем класаў польскай школы. Па вясковых мерках, гэта была нядрэнная адукацыя. Цалкам верагодна, што прадоўжыў бы вучыцца ў савецкі час, але 41-ы год усе планы перакрэсліў. Першыя дні вайны Павел Данілавіч запомніў тым, што ў небе з'явіліся самалёты. Гэта былі нямецкія бамбардзіроўшчыкі, яны ляцелі на ўсход, звычайна звёнамі па тры альбо па пяць. І было вельмі страшна, непрывычна для вясковых людзей: гэты злавесны гул у небе спачатку прымушаў уцякаць, хавацца... Потым, у наступныя тыдні, у вакольцы з'яўлялася шмат салдат-чырвонаармейцаў, якія адступалі, выбіраліся з акружэння. Многія, каб выратавацца, пераапраналіся ў грамадзянскае адзенне, заставаліся ў гаспадарэй, наймаліся на работу. Усе тады думалі аб адным — выжыванні. Калі немцы трывала аселі і агледзеліся, пачалі забіраць асобных вясковых кватарантаў на падазрэнні ў іх прыналежнасці да Чырвонай Арміі. Хлопцы сталі райцаа аб тым, што трэба сыходзіць у

Павел МАКАРЭВІЧ і старшыня сельскага Савета Аляксандр ЗАВЕРАЧ.

лес і арганізоўваць партызанскі атрад.

Павел Данілавіч добра ведае гэтыя факты. Усё тлумачэцца ў памяці яшчэ і таму, што дарога гаварылі аб гэтым і пасля вайны. «У Хомску быў пастарунак, паліцэйскі ўчастак, дзе захоўвалася зброя. Кіраваў участкам мясцовы выхар Іван Чачун. Яго швагер жыў у нас, у Заазленні. Вось яны і дамовіліся пра аперацыю. У вызначаны дзень на варце ў пастарунку сталяі свае людзі (паліцаі таксама розныя былі). Яны і прапусцілі былых вайскоўцаў і будучых партызан. Тыя амаль без выстралаў абязброілі ўчастак, забралі зброю і боепрыпасы і рушылі з трафеямі ў партызанскі атрад». Пасля гэтага ў Хомску адбылася карная аперацыя, у выніку яе забілі больш за 190 жыхароў вёскі, спалілі дамы.

Лютаўскі прызыў

Атрад стаў расці, у партызаны пайшоў і старэйшы брат Паўла Макарэвіча. «Як жылі пад акупацыяй? У вечным страху, — расказвае Павел Данілавіч. — Брат быў у лесе, мы ж таксама лічыліся партызанскай сям'ёй. Нямецкі гарнізон стаяў у Драгічыне. Як толькі пачуем, што немцы рушылі ў наш бок, хаваемся ў лясах. Не ўспомню цяпер, колькі разоў даводзілася

вось так бегчы ды сядзець там розны час. Так і жылі да самага вызвалення».

У сакавіку 1945-га Паўлу споўнілася васямнаццаць, а ў лютым яго ўжо прызвалі ў армію. Разам з іншымі навабранцамі хлопец з драгічынскай вёскі трапіў у вучэбку ў расійскі горад Казельск. Вывучалі станкавы кулямёт. Потым паступілі новы загад, і асобных курсантаў перавезлі ў горад Горкі, за 400 кіламетраў ад Масквы, тут салдат асвоіў яшчэ адну спецыяльнасць — ваеннага сувязіста. У вучэбнай часці яны і сустрэлі паведамленне пра Перамогу і капітуляцыю Германіі. Але Другая сусветная яшчэ не скончылася, наперадзе была вайна з Японіяй. І ў жніўні наваспечаны сувязіст са сваёй часцю накіраваўся па чыгунцы ў Манголію, а затым у Маньчжурыю. Але, на шчасце, навабранцы дабраліся да месца пад павеламленне аб капітуляцыі Японіі. На перадавой Паўлу Макарэвічу пабываць не давялося. Але ад вайны ён нацярпеўся нямала. Так што статус удзельніка Вялікай Айчыннай вайны мае заслужаны. У арміі захварэў на крупознае запаленне лёгкіх. Стан быў такі, што салдата камісавалі і адправілі дадому. Працэс выздараўлення і рэабілітацыі заняў два гады. «Я проста ісці не мог доўга, задыхаўся, не мог працаваць, — успамінае ветэран, — цяжка выкараскаўся з хваробы».

Калі ўсё ў руках гарыць

У канцы 40-х пачаўся другі этап жыцця ветэрана — працоўны. Больш за паўвека адпрацаваў Павел Данілавіч у калгасе імя Кірава. На любым участку, на любой рабоце быў у ліку першых. Пэўны час шчыраваў на пілараме. Будавалі тады многа, дошкі былі патрэбныя. Навучыўся абыходзіцца з драўнінай з маладых гадоў. Потым дом сабе збудаваў фактычна ўласнымі рукамі, крыху дапамагаў брат. І ўсё, што ў доме, — таксама. Сядзім у пакоі, звяртаю ўвагу на шафу, тумбачку, карнізы.

— Усё маіх рук справа, — перахоплівае позірк ветэран і ўсміхаецца: — А яшчэ вокны, дзверы мог зрабіць, сані, брычку. Людзям шмат дапамагаў у будаўніцтве дамоў.

Бываюць жа такія таленавітыя людзі, за што ні возьмуцца, усё ў руках гарыць. Каб падтрымаць сям'ю, зарабіць лішнюю капейку, скончыў кравецкія курсы, шыў верхняе адзенне і кажухі. Няма, мусіць, той работы, якая б ні скарылася вясковаму жыхару. Да гэтай пары на пачсноым месцы ў доме захоўваецца ўрадавая грамата, якая сведчыць, што ў 1974 годзе Павел Макарэвіч па выніках спаборніцтва быў прызнаны найлепшым аператарам збожжасушыльнага комплексу. Колькі таго збожжа перасушыў на КЗСе, сказаць цяжка, увесь калгасны хлеб праходзіў праз яго рукі.

Чалавек-рух

А ўжо свая гаспадарка заўсёды магла быць узорам для іншых. Улетку першым сярод касцоў паднімаўся да зоркі, на сваю карову накошваў нават на няўдобіцах. Дарэчы, можа, гадоў пяць таму толькі збыў каня. У Хомску памятаюць яго адмысловы воз. Усе ўжо даўно абсталявалі падводы гумовымі коламі, і толькі ў Данілавіча былі драўляныя на металічнай аснове. Для іх выткорваслі, дарэчы, гаспадару давялося вырабіць асобны станок. Успомніў таксама, як зрабіў невялікі ўласны млын. «З моцнага цэменту адліў жорны, пазней прыладзіў да ўстаноўкі матор, мой млынок працуе да гэтай пары. Можна змалоць любое зерне. Раней карысталіся для ўласнай гаспадаркі. Трэба было, напрыклад, змалоць збожжа сіннням на корм», — кажа пенсіянер.

Старшыня Хомскага сельскага Савета Аляксандр Заверач сказаў, што такіх умельцаў, як Павел Данілавіч, у акрузе больш не знойдзеш: «А яшчэ ён заўсёды быў аптымістам, заўсёды нешта рабіў, стварай. Нават ва ўзросце пад дзевяноста ніколі не ведаў, што сядзіць на лаўцы. Данілавіч — гэта чалавек-рух, які дасць фору любому маладзейшаму».

З жонкай Любоўю Аляксандраўнай выгадавалі трох цудоўных дачок. Усе атрымалі адукацыю, працавалі ў розных сферах, раз'ехаліся па ўсёй былой вялікай краіне. Толькі Ніна засталася ў Беларусі. Валянціна жыве ў Крывым Розе, Свяглана — у С.-Пецярбургу. Зараз Свяглана Паўлаўна пераехала ў вёску, каб быць разам з бацькам. А да леташняга года ён абыходзіўся сам, дзеці альбо ўнукі прыязджалі толькі на выхадныя. Год-два таму яшчэ на веласіпедзе ў краму ездзіў.

— Шмат чаго пабачыла наша пакаленне, — разважае Павел Данілавіч. — І самае страшнае з усяго — вайна. Пражыўшы столькі гадоў, асабліва адчуваеш, што чалавек прыходзіць у гэты свет, каб паляпшаць яго сваёй працай, а не разбураць. Захоўвайце мір, беражыце яго!

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота аўтара.

Драгічынскі раён.

ПАМНАЖАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ

Адбыўся X з'езд Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане

Воіны-інтэрнацыяналісты з усёй краіны сабраліся разам, каб не толькі падвесці вынікі работы за 2017—2022 гады, але і падзяліцца сваімі меркаваннямі, праблемамі, на якія неабходна звярнуць увагу як унутры арганізацыі, так і на самым вышэйшым узроўні. Акрамя таго, дзелегаты абмеркавалі дзейнасць ветэранскай арганізацыі на найбліжэйшую пяцігодку.

Адкрываючы з'езд, **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** агучыў зварот Аляксандра Лукашэнкі да яго дзелегатаў. У прывітанні, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сучасным свеце злом традыцыйных маральных нормаў суправаджаецца грэбаваннем урокамі гісторыі і вопытам папярэдніх пакаленняў, спробамі прынізіць, сказіць подзвіг савецкіх салдат і афіцэраў, якія зэўсёды неслі людзям свабоду, абаранялі іх права жыць і працаваць пад мірным небам і самім выратаць свой лёс. «Воіны-інтэрнацыяналісты як ніхто ведаюць каштоўнасць чалавечага жыцця, магчымасці стварацъ і расціць дзяцей у свабоднай ад вайны і разбуральнай краіне, — падкрэсліў беларускі лідар. — Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане шмат гадоў свята захоўвае і памнажае традыцыі слаўнага подзвігу ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, актыўна працуе на ніве грамадзянска-патрыятычнага выхавання, з'яўляецца надзейнай апорай для сем'яў аднапалчан, якія сышлі».

— Сёння ветэранская арганізацыя запатрабаваная як ніколі, — заўважыў падчас гутаркі з журналістамі Ігар Сергеенка. — Воіны-афганцы актыўна прымаюць удзел у патрыятычным выхаванні моладзі. Кіраўніцтва гэтай структуры падтрымлівае ветэранаў, інвалідаў, сем'і загінулых афіцэраў і салдат у гады афганскай вайны. Самае галоўнае, што праз многія-многія гады яны пранеслі гэтую памяць сяброўства, воінскай вывучкі, братэрства, беражна ставяцца да захавання гісторыі.

Як удакладніў Ігар Сергеенка, можна па-рознаму ставіцца да той далёкай вайны, выканання інтэрнацыянальнага абавязку, але тады сітуацыя адназначалася некалькі па-іншаму, чым яна бачыцца сёння. «Воіны-інтэрнацыяналісты былі першымі пасля ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія сутыкнуліся непасрэдна з агрэсарам, з тэрарызмам на тэрыторыі чужой краіны і праявілі там і стойкасць, і мужнасць, і гераізм, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Аб гэтым сёння трэба расказваць моладзі, тлумачыць, што за гэтым стаіць вялікая ратная воінская праца. У нашай краіне многае робіцца і для ўвекавечвання памяці загінулых, і самае галоўнае, каб тыя, хто жыве сёння, не адчувалі сур'ёзных жыццёвых праблем, а тым, хто сутыкнуўся з пэўнымі цяжкасцямі, своечасова аказвалі дапамогу».

Па словах Ігара Сергеенкі, воіны-інтэрнацыяналісты прыходзяць на змену ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Падзяліўся ён і сваім меркаваннем наконт таго, што адбываецца на тэрыторыі еўрапейскіх краін, калі зносяцца помнікі савецкім воінам-вызваліцелям. «Толькі ў Польшчы загінула 600 тысяч салдат і афіцэраў, якія вызвалялі гэтую краіну, — акцэнтаваў увагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Я ўжо не кажу пра тое, якія сур'ёзныя ахвяры былі ў Германіі — узяцце Берліна. І тое, што сёння адбываецца, асабіста ў мяне выклікае пачуццё абурэння, злосці. Як так можна, калі ўсе 80 гадоў з гэтым асацыявалі подзвіг савецкага салдата, вызваленне Еўропы ад «карычневай чумы», а сёння гісторыю паварочваюць назад. Гісторыя такіх рэчаў не даруе».

— Гэтая пяцігодка была багатая на знакавыя падзеі: парламенцкія і прэзідэнцкія выбары, канстытуцыйны рэферэндум, — ва ўсіх іх мы прымалі актыўны ўдзел, працавалі ў выбарчых камісіях і ў якасці назіральнікаў, — паведаміў **старшыня савета Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.** — Мы, людзі, якія прайшлі горан вайны і маюць баявы вопыт, разумеем, што зэўсёды павінны стаяць на варце законнай улады — і толькі ў адзінстве наша сіла.

Як расказаў **старшыня савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць» Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Уладзімір ШОКАЎ**, апошнім часам вялікую ўвагу воіны-інтэрнацыяналісты стаці больш удзяляць патрыятычнаму выхаванню моладзі. «Увялі ў школы кіраўнікоў па ваенна-патрыятычнай падрыхтоўцы, стваралі музейныя экспазіцыі, праводзім сумесныя з моладдзю мерапрыемствы, круглыя сталы, суботнікі, у тым ліку вучым яе абараняць нашу Радзіму», — заўважыў ён.

Напрыканцы з'езда дзелегаты перавыбралі Валерыя Гайдукевіча на пасаду старшыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане.

Веранiка КАНЮТА.

КУДЫ ЎКЛАСЦІ СВАБОДНЫЯ ГРОШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэцяе правіла самае складанае і патрабуе самаконтролю, але навучыць кіраваць выдаткамі з дапамогай эканоміі і аптымізацыі выдаткаў. Апошняе прадугледжвае разумнае перараспрамеркаванне расходаў па артыкулах з мінімальнымі стратамі ва ўзроўні і ладзе жыцця.

Парады ад рэгулятара

Нацбанк рэкамендуе некалькі спосабаў інвеставання грошай. Першы з іх (дзяржаўныя аблігацыі) лічыцца самым бяспечным, але і найменш прыбытковым. У складаны для эканомікі час працэнты па такіх каштоўных паперах сапраўды маленькія, таму зараз у насельніцтва няма попытам не карыстаюцца.

Наступным спосабам укладання нашых «кроўных» з'яўляюцца банкаўскія ўклады, дэпазіты, ашчадныя сертыфікаты, аблігацыі банкаў. Потым ідуць карпаратыўныя аблігацыі і апошнімі — акцыі прадпрыемстваў.

Калі грошай столькі, што можна купіць нерухомасць

Купля нерухомасці — адзін з самых выгадных і папулярных на сёння спосабаў памнажэння капіталу. Няма нічога больш прыемнага, чым мець у сваім гарадзе дзве-тры кватэры і здавацъ іх у арэнду. Штомесячны заробак ад гэтага дазволіць вам жыць калі не шыкоўна, то цалкам нармальна.

Дарэчы, купляць кватэры для інвеставання ў працэсе іх актыўнага патаннення не зусім правільна. Аднак, я трымаў бы руку на пульсе. Заўсёды трэба ўлавіць момант, калі час масавага патанння ўжо прайшоў і пачынаецца зваротны працэс.

Да таго ж збіраемся разглядаць наш сярэднестатыстычны варыянт, па якім будзем укладваць не вельмі вялікую суму — блізкую ў эквівалэнце да дзесяці тысяч долараў. У гэтым выпадку цалкам рэальна разглядаць банкаўскія ўклады.

Валюту зберажэнняў трэба выбіраць абдумана

Як ні дзіўна, але памер даходу напрамую залежыць ад валюты, у якой збіраемся зэхоўваць нашы зберажэнні. Айчыннія эканамісты лічаць, што збіраць грошы можна ў любой валюце, якая падпарадкоўваецца эканамічным законам. Адгадаць, што будзе больш устойлівым: долар, еўра, рубель або швейцарскі франк, — цяпер вельмі складана. Іншыя фінансісты прыводзяць залатое правіла ўкладанняў: не класці ўсе яйкі ў адзін кошык. Рэкамендуецца 60 % укладаў трымацъ у айчыннай валюце, па 20 % — у доларах і еўра.

Існуюць розныя прагнозы аб тым, што долар можа абрынуцца. Таму можна ўкласці грошы і ў долар, і еўра, а можна — і ў рублі. Можна паспрабаваць пашукацъ і іншыя ўстойлівыя валюты. Напрыклад, у кітайскі юань. Дарэчы, адзін юань дзеліцца на 10 цзяа, якія, у сваю чаргу, дзеляцца на 10 фыняў.

Сёння мы назіраем чаргавы працэс умацавання беларускага рубля. У свой час, калі долар на ажыятажы прадаваўся па 4 рублі, спецыялісты не раілі яго набываць па такім кошце і мелі рацыю. Сёння гэтая зялёная паперка вагаецца ў коштавым дыяпазоне ад 2,68 да 2,75 рубля за долар і працягнае танець. Таму цікавасць да дэпазітаў непасрэдна ў доларах расці не можа.

Ад сябе асабіста дадаў бы, што, калі вы не збіраецеся за мяжу, тады трэба выбіраць замежную валюту для інвестыцый, дзе самая маленькая маржа (розніца паміж купляй і продажам банкнот). У нашых беларускіх рэаліях гэта якраз долар. Але не варта забываць, што самыя вялікія працэнты па ўкладах менавіта ў рублёвых дэпазітах.

Ад 7 % да 25 % гадавых

Пасля таго як у нашай банкаўскай сістэме значна павялічылі стаўку рэфінансавання Нацбанка адразу амаль на тры пункты — да 12 % гадавых, камерцыйныя банкі сталі істотна павышаць даходнасць дэпазітаў у нацыянальнай валюце.

Самы маленькі даход вы атрымаеце па адзыўным дэпазіце пры кароткіх тэрмінах захоўвання. За такія «кароткія» грошы банкі даюць ад 7 % да 10 % гадавых. Адзыўныя ўклады на больш працяглы перыяд (ад 3 месяцаў да года) маюць большую прыбытковасць — ад 13 % да 16 % гадавых.

Найбольш распаўсюджаныя безадзыўныя ўклады прапануюцца тэрмінам ад трох месяцаў да двух гадоў. За такія ўмовы банкі гатовыя заплаціць уласнікам грошай ад 19 % да 22,5 % гадавых. А самыя выгадныя дэпазіты прадугледжваюць да 25 % гадавых за безадзыўны ўклад на тэрмін 7 месяцаў, праўда, без пралангацыі і без дадатковых узносаў. Гэты выгадны варыянт дэпазіту кліент можа заключыць з банкам толькі дыстанцыйна (праз сістэму інтэрнэт) пры наяўнасці банкаўскай карткі ў патэнцыйнага спажыўца.

І яшчэ. Фіксаваная стаўка працэнтнага даходу прапануецца банкамі на невялікія тэрміны карыстання грашыма (ад 45 сутак да 3 або 6 месяцаў). На больш працяглыя тэрміны дэпазітаў выкарыстоўваецца так званая пераменная стаўка. Гэта калі працэнты па дэпазіце змяняюцца ў залежнасці з каірыкіроўкай стаўкі рэфінансавання Нацбанка. Падобна на тое, што камерцыйныя банкі разлічваюць, што сітуацыя з грашовымі патокамі ў нашай краіне на рынку наяўных фінансавых сродкаў у хуткім часе стабілізуецца.

Не ўсе аблігацыі аднолькава бяспечныя

Укладваць свае грошы ў куплю каштоўных папер рызыкне не кожны. І справа нават не ў тым, што кампаніі сёння і знікаюць, і адраджаюцца з маланкавай хуткасцю. Праблема ў тым, каб вылічыць, якая кантора стане доўгажыхаром, а якая — матыльком-аднадзённай. Для гэтага патрабуюцца спецыяльныя веды, якіх у звычайнага чалавека проста няма.

Зараз у нашай краіне наладжана рэалізацыя карпаратыўных аблігацый. У Беларсбанку створана спецыяльнае прадпрыемства, якое гэтым займаецца. Да апошняга часу досыць бяспечнымі лічыліся каштоўныя паперы Беларускай чыгункі. Даход па гэтых аблігацыях, намінаваных у доларах, прадугледжваў 4,75 % гадавых. Дывідэнды па каштоўных паперах (паводле курсу ў беларускіх рублях) выплачваюцца адзін раз на тры месяцы.

Наогул, у «скарбонцы» арганізацыі гэтага банка зараз прадаецца мноства аблігацый розных прадпрыемстваў і фінансавых кампаній. Гэта і добра вядомыя фірмы, і структуры, якія былі створаны нядаўна. Дзеля прыбытковасць гэтых каштоўных папер вар'іруецца ад 6 % гадавых да 9 %. Літаральна днямі выпусціла аблігацыі ўдна вядомая гандлёвая сетка нашай краіны. Яна наогул абяцае 10 % гадавых у валюце.

Ёсць там і аблігацыі, намінаваныя ў еўра і беларускіх рублях. Дык вось, максімальная стаўка даходнасці аблігацый у айчыннай валюце роўная 27 % гадавых.

Трэба браць?

Сяргей КУРКАЧ.

ПАСХА, ЯЙКІ, КУЛІЧЫ...

Як выйсці з Вялікага посту правільна?

У праваслаўных набліжаецца светлае свята Уваскрэсення Хрыстова або Вялікдзень. Асноўныя стравы святочнага стала — гэта куліч, яйкі і творожная пасха. Не кажучы ўжо аб багацці страў пасля выхаду з Вялікага посту. Як быць, каб і ў гэты дзень выконваць баланс у харчаванні і не пакутаваць потым тыдзень строгімі абмежаваннямі? Парадамі падзялілася ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Інга ФЯДОТКАВА.

• Для куліча выкарыстоўвайце муку буйнога памолу, мінімум цукру, лепш дадаць у цеста салодкія сухафрукты, кефір або малако нізкай тлустасці, можна нават ваду. У ідэале не выкарыстоўваць дрожджы. Выдатны куліч можна прыгатаваць на яблычным пюрэ, наприклад.

• Што датычыцца пасхі, дя гатавання лепш выкарыстоўваць тварог і смятану нізкай тлустасці, сухафрукты, ягады, арэхі, але з апошнімі трэба быць асцярожнымі, бо яны хоць і карысныя, аднак вельмі каларыйныя.

Адна з навацый датычыцца электрасамакатаў, гіраскутараў, моноколаў, сігвэяў і іншых сродкаў персанальнай мабільнасці, як іх прынята будзе называць. Перамяшчацца з іх дапамогай неабходна па веласіпеднай дарожцы, а пры яе адсутнасці — па тратуары, пешаходнай дарожцы ці абочыне, прычым з хуткасцю не больш**ай за 25 км/г. Акрамя таго, сродкі персанальнай мабільнасці не павінны стварацъ перашкоды для руху пешаходаў. Выкарыстоўваць іх могуць толькі асобы, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту. Гэтае абмежаванне не будзе дзейнічаць у жылых і пешаходных зонах.

Хуткасны рэжым

Кіроўцам аўтатранспарту варта звярнуць увагу на хуткасныя ліміты на дарогах, якія пралягаюць не праз населеныя пункты. Калі дакумент уступіць у сілу, па-за населеныі пунктамі на аўтамагістралях і дарогах для аўтамабіляў матацыклы, легкавыя аўто, а таксама грузавыя аўтамабілі масай не больш як 3,5 тоны могуць перамяшчацца з хуткасцю да 120 км/г. Аўтобусам будзе дазволена рухацца з хуткасцю не вышэй чым 100 км/г. Раней хуткасныя рэжымы на аўтамагістралях складалі 110 км/г для ўсіх аўтамабіляў і 90 км/г для аўтобусаў.

Як адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення арганізацыйнай работы і забеспячэння правапрымяняльнай дзейнасці МУС палкоўнік міліцыі Аляксандр ЗАНІМОН,** нягледзячы на павышэнне хуткасных рэжымаў на аўтамабільных дарогах, прадугледжаны і пэўныя абмежаванні, звязаныя з панежэннем максімальна дапушчальнай хуткасці. «Для гэтага былі ўведзены новыя знакі і паняцці ў Правілы дарожнага руху», — заўважыў супрацоўнік органаў унутраных спраў.

Новы знак

Фота з адкрытых крыніц

Каб не ўстанаўліваць пэўсюль абмежавальныя знакі, прадугледжаны новы комплексны знак, які на пэўнай тэрыторыі выцясніць тое ці іншае абмежаванне хуткасці. Новы дарожны знак будзе называцца «Зона з абмежаваннем максімальнай хуткасці руху». Пры яго наяўнасці хуткасць руху транспартных сродкаў на вызначаных тэрыторыях (напрыклад, у зоне інтэнсіўнага руху пешаходаў) будзе абмежавана. Гэта можа быць і 10 км/г, і 40 км/г — усё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі.

Як расказалі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, падобныя зоны шырока прымяняюцца ў суседняй практыцы. Іх выкарыстанне дазволіць зрабіць дарожны рух больш бяспечным без устаноўкі «спячых паліцэйскіх» і дадатковых знакаў, якія абмяжоўваюць хуткасны рэжым.

Уключэнне фар у дзённы час

Калі раней перад пачаткам і заканчэннем навучальнага года Дзяржаўная аўтаінспекцыя разнастайнымі спосабамі апавяшчала кіроўцаў аб уключэнні бліскага святла фар у дзённы час, то цяпер гэты момант замацаваны заканадаўствам. І адгаворкі накшталт «не ведаў» і «не чуў» не прымаюцца. Замацаваны канкрэтныя даты, у якія, сэўшы за рулі свайго транспартнага сродку, кіроўца абавязаны ўключыць бліскае святло фар нават у светлы час сутак: у перыяд з 25 мая да 5 чэрвеня і з 25 жніўня да 5 верасня. Такім чынам, акцыі, якія правадзяцца супрацоўнікамі ДАІ, прымеркаваныя да пачатку і заканчэння навучальнага года, замацоўваюцца ў правілах дарожнага руху.

Перавага ў руху

У мэтах павышэння бяспекі дарожнага руху ўдакладняецца парадак атрымання перавагі ў руху. Яна будзе пільцыца зробленай, калі адлеглась паміж транспартным сродкам і пешаходам, які перасякае дарогу, складае не менш як дзве паласы руху (калі яны ёсць).

Электрамабілі

Для гэтага віду транспарту прадугледжаны шэраг навацый. У прыватнасці, электрамабілям даецца права праезду на паласе, прызначанай для руху грамадскага транспарту. Дакумент гарантуе забяспечыць і даступнасць электразарадной інфраструктуры. Гэтыя і іншыя новаўвядзенні накіраваны на стымуляванне выкарыстання электратранспарту.

П'яным пасажырам — не месца на мотатранспарце!

Увага ўладальнікаў матацыклаў і мапедаў! З моманту ўступлення ўказу ў сілу на матацыклах (за выключэннем, калі адсутнічае бакавы прычэп) і мапедах забаронена перавозіць пасажыраў, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення. У выпадку спрэчнай сітуацыі па патрабаванні супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі дадзеныя асобы абавязаны будуць прайсці медыцынскі агляд.

Веласіпедыст павінен быць абазначаны

Дакументам удасканальваецца парадак удзелу веласіпедыстаў у дарожным руху. Падчас перамяшчэння па-за населеныі пунктамі ў цёмны час сутак яны абавязаны будуць знаходзіцца ў адзенні са светлаадлюбівымі элементамі. Флікера цяпер недастаткова! Справа ў тым, што, абазначыўшы сябе апошнім, веласіпедыст упэўнены, што яго відаць на дарозе ў цёмны час сутак. Аднак так бывае не заўсёды. Чалавек можа зафіксаваць светлаадбівальны элемент такім чынам, што ён становіцца незаўважным для іншых удзельнікаў дарожнага руху або бачны толькі з аднаго боку праезнай часткі.

Без абазначэння сябе адзенне**м са светлаадбівальнымі элементамі ў цёмны час сутак веласіпедыстам дазваляецца рухацца толькі па веласіпедная дарожцы. Акрама таго, перасякаць праезную частку веласіпедыст будзе абавязаны па веласіпедным пераездзе або веласіпедная дарожцы. Калі ж такія адсутнічаюць, то па пешаходным пераходзе, на скрыжаванні па лініі тратуараў ці абочын, не стваральчы пры гэтым перашкод для пешаходаў. Пры гэтым веласіпедыст мае права не спешвацца, перад выездам на праезную частку ён павінен загадзя знізіць хуткасць і перасякаць дарогу з хуткасцю пешахода, які ідзе.

Яшчэ паўгода ўдзельнікі дарожнага руху карыстаюцца папяровымі Правіламі дарожнага руху. Новая іх рэдакцыя ўступіць у сілу толькі ў канцы кастрычніка.

Тонкасці прафесіі

ПРАБЛЕМЫ ДЗЯЦЕЙ — АДКАЗНАСЦЬ БАЦЬКОЎ

Карэспандэнты «Звязды» разам з інспектарам па справах непаўналетніх наведалі сем'і, якія знаходзяцца на кантролі міліцыі

Аб прафесіі міліцыянера Валерыя ЗОРКА з самага дзяцінства ведала крыху больш за тое, што паказваюць у кінастужках: у органах унутраных спраў служыў і працягвае гэта рабіць яе бацька. Ён, ужо палкоўнік міліцыі, не настойваў, каб дачка працягнула дынастыю. Гэтае рашэнне Валерыя прыняла сама: пакуль атрымлівала вышэйшую юрыдычную адукацыю, падчас практыкі змагла паспрабаваць свае сілы і ў пракуратуры, і ў судзе. Аднак усё было не тым, чаму б яна хацела прысвяціць сваё жыццё.

Валерыя марыла аб афіцэрскіх пагонах і разам з тым хацела працаваць з дзецьмі. Такая прафесія для яе знайшлася ў органах унутраных спраў — вось ужо як пяць гадоў дзяўчына з'яўляецца ўчастковым інспектарам па справах непаўналетніх Маскоўскага РУУС Мінска.

СКЛАДАНЫЯ АБСТАВІНЫ

Са старшым лейтэнантам міліцыі мы сустрэліся на апорным пункце. Як прызнаецца Валерыя Зорка, у сваім кабінеце яна бывае нявыпад часу: прыходзіць сюды, каб папрацаваць з дакументамі і пагутарыць з дзецьмі, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Увесь астатні час працуе на месцах. Выступае перад школьнікамі, наведвае сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці, якія трапілі на кантроль інспекцыі. Нядрэнна ў павышанай увазе праваахоўніку маюць патрэбу іх бацькі.

А яшчэ Валерыя, як і ўсе супрацоўнікі міліцыі, заступае ў наряды і ідзе патрулявацъ гарадскія вуліцы, забяспечвае правапарадак падчас святочных урачыстасцяў і масавых гулянняў, удзельнічае ў пошукавых мерапрыемствах, галоўнымі фігурантамі якіх выступаюць непаўналетнія, якія пражываюць на яе ўчастку. На цяперашні момант Валерыя Зорка адказвае за 24 сям'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. З дзецьмі, якія ў іх выхоўваюцца, старшы лейтэнант міліцыі ўзаемадзейнічае як на сваім апорным пункце, так і па-за яго межамі. Акрама таго, інспектар рэгулярна наведвае гэтыя сем'і. Днямі карэспандэнты «Звязды» напрасіліся да яе ў памочнікі.

На першым адрасе, куды мы завіталі, пражывае мама з пяцюю дзецьмі. Валерыя загадзя папярэдзіла: пяць гадоў, якія яна працуе інспектарам, сям'я кантралюецца інспекцыяй па справах непаўналетніх. «Усіх дзяцей выхоўвае адна маці, аліментаў не атрымлівае, — уводзіць у курс справы супрацоўнік міліцыі. — Жанчына не п'е, працуе, але яе заробку не хапае, каб забяспечыць сям'ю нават самым неабходным. З-за таго, што шмат часу правадзіць на працы, маці не ў стане пракантраляваць паводзіны сваіх дзяцей у вольны ад вучобы час».

У полі зроку міліцыі за ўжыванне алкагольных напояў знаходзіўся яе старэйшы сын, які ўжо паўналетні. Цяпер на кантролі — сярэдні сын, які здзейсніў дробнае хуліганства. А не так даўно была заўважана на кradзяжы яшчэ і малодшая дачка, якая скрала ў сяброўкі грошы і гульні. «Ёсць сем'і, да якіх ставіцца са спачуваннем, — заўважае Валерыя Зорка. — У гэтай сям'і вельмі складаная сітуацыя. Яшчэ і дзеці не шкадуюць сваю маці».

Нас сустрэла сама гаспадыня. Расказала, што пазнаёмілася з інспектарам, калі яе сярэдні сын вучыўся яшчэ ў пачатковых класах. «Ён з маленства ў мяне хуліган: любіць памахаць кулакамі, — расказвае жанчына. — Бацька рана памёр, хлопчык стаў агрэсіўны, вось і пачаў вымяшчаць злосць на іншых».

У кватэры, дзе жыве сям'я, даволі сціпла, затое парадак. Жыллёвай плошчы таксама хапае. Чаму да яе сям'і такая ўвага, гаспадыня добра разумее. «Заробак у мяне невялікі: тое, што зарабіла, у той жа дзень аддала ў краме: дзеці кожны дзень есці хочуць, — кажа шматдзетная маці. — Нягледзячы на тое, што працую з раніцы да вечара, часта не па сілах мне заплаціць нават за камунальныя паслугі».

ВЫПРАВІ�ць СІТУАЦЫЮ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

Пакуль накіроўваемся ў наступную сям'ю, Валерыя Зорка тлумачыць: калі дзіця здзейсніла злачынства або правапарушэнне, але яшчэ не дасягнула ўзросту адказнасці, то апошняя ўскладаецца на бацькоў. «Ставіцца пытанне аб тым, што бацькі не выканалі абавязкі па выхаванні свайго дзіцяці, у выніку чаго яно здзейсніла супрацьпраўнае дзеянне, — удакладняе супрацоўнік міліцыі. — Калі на падставе характарыстыкі з установы адукацыі мы зможам даказаць, што бацькі ўдзельнічаюць у выхаванні дзіцяці, цікавяцца яго жыццём у школе, адэкватна рэагуюць на ўсе заўвагі, усяляк спрабуюць паўплываць на паводзіны свайго нашчадка, то мы маем права пратакол не складаць. У такім выпадку штрафных санкцый атрымаецца пазбегнуць, аднак усё роўна ў дачыненні да малалетняга праваахоўнікі будзе праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Становішча гэтай маці, якая адна выхоўвае пяцярых дзяцей, калі мы выпішам штраф, яшчэ больш пагоршыцца. Да кожнай сям'і трэба падыходзіць з разуменнем».

Дарэчы, у абавязкі ўчасткоўага інспектара ўваходзіць не толькі наведваць такія сем'і, а таксама праводзіць з імі прафілактычныя гутаркі. Займаецца яна і арганізацыяй вольнага часу сваіх падапечных.

— Толькі за апошні месяц мы правялі для дзяцей турнір па футболе, настольным тэнісе, дартсе, вадзілі іх катацца на каньках у школу алімпійскага рэзерву па фігурным катанні, — расказвае інспектар па справах непаўналетніх. — Спрабуем не толькі словам, але і справай уцягваць дзяцей у канкрэтную дзейнасць. Паказваем гэтым, што ў жыцці ёсць вельмі шмат цікавых заняткаў, на якія можна патраціць свой час, не парушаючы прыгожага заканадаўства.

Перастаўпіўшы парог наступнай кватэры, куды мы прыйшлі з інспектарам, зловіла сябе на думцы, што нешчалівай гэтую сям'ю язык не павернецца назваць. Прыгожая, дагледжаная кватэра з сучасным рамонтам, салідны мужчына, які нас сустракае, — што магло здарыцца, каб гэтая сям'я трапіла ў поле зроку кампетэнтных органаў?

Як высветлілася, у гаспадароў — тры сыны. Адзін ужо дарослы, ажаніўся. Разам з жонкай пасяліўся ў бацькоў: у вялікай кватэры, па словах гаспадароў, усім месца хопіць. Так некаторы час і было, пакуль у сям'і не здарылася нясшасце. У сына і яго жонкі зніклі грошы. Сума немалая (восем тысяч долараў), таму маладыя звярнуліся ў міліцыю. Яны нават і падумаць не маглі, што злодзеем аказаўся не хтосьці чужы, які пранік у кватэру і скраў усе зберажэнні, а малодшы брат пацярпелага. Пакуль апошні выявіў прапажу, грошы ўжо былі патрачаны. За іх падлетак набыў веласіпед, кармілў сябе і сяброў у рэстаранах, катаўся на таксі.

А, між іншым, малалетняму злодзею — 15 гадоў. Згодна з заканадаўствам, ён асабіста няпе адказнасць за зробленае. Падлетак мог правесці два гады ў месцах не вельмі адданлеых, аднак з улікам узросту і іншых абставін мера стрымання была зменена на два гады хатняга арышту. З таго часу ў гэтай кватэры супрацоўнікі міліцыі, а таксама настаўнікі — частыя госці. З сямі вечара і да шасці раніцы хлопец абавязаны знаходзіцца дома. Падчас выхадных і святочных дзён яму ўвогуле нельга пакідаць месца жыхарства. Акурат гэта і кантралююць кампетэнтныя органы.

Фота Ганны ГОЛАД

Бацька падлетка нават у самым жудасным сне не мог уявіць, што такое можа здарыцца ў яго сям'і. Больш за тое, сапсавалася ўзаемаадносіны са старэйшым сынам і яго жонкай, якія вымушаны былі з'ехаць з кватэры. «У тым, што здарылася, безумоўна, вінаваты і мы, — прызнаецца гаспадар. — Дваіх сыноў выхавалі, праблем ніякіх не было, думалі, што і з апошнім іх не будзе. Больш часу праводзілі на працы, менш увагі ўдзялялі малодшаму сыну, які яшчэ і атрымліваў усё, што хацеў. Вось чым гэта скончылася».

Бацька не губляе надзеі: яшчэ можна выправіць сітуацыю. Цяпер падключае яго да сваёй работы, складае на сына некаторыя хатнія абавязкі, кантралюе кожны яго крок: добра разумее, што за парушэнне і правапарадку, і рэжыму нашчадку свеціць ужо рэальнае пазбаўленне волі.

ПАРУШАЮЦЬ ЗАКОН НЕ ТОЛЬКІ ХЛОПЦЫ

Пакуль ідзём па іншым адрасе, спрабую разабрацца, як у забяспечанай, прыстойнай, поўнай сям'і магло здарыцца такое няшчасце.

— Гэта стэрэатып, што на ўліку ў інспекцыі стаяць дзеці з сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — акцэнтуе ўвагу участковы інспектар. — Ёсць дзеці і з забяспечаных сем'яў, дзе бацькі не злоўжываюць алкаголем. З-за таго, што яны вельмі занятыя кар'ерай і, адпаведна, не маюць часу займацца выхаваннем дзяцей, узнікаюць праблемы. Забяспечваючы дзіця ўсім неабходным, бацькі забываюцца, што не гэта самае галоўнае.

А яшчэ дзеці ідуць на злачынства не толькі з-за недахопу любові і ўвагі з боку бацькоў, але і з-за таго, што нічым не занятыя ў вольны час. «Вядома, сярод тых, хто трапіў на кантроль міліцыі, ёсць і поўнасцю арганізаваныя дзеці, якія наведваюць гурткі, секцыі, факультатывы, — расказвае супрацоўнік міліцыі. — А ёсць тыя, якім нічога не трэба. Іх нават складана ўгаварыць наведаць пэўную экскурсію ці спартыўнае мерапрыемства. Спрабуеш да кожнага знайсці падыход, але ўсе дзеці розныя. Адны з лёгкасцю ідуць на кантакт, з іншых жа слова лішняга не выцягнеш».

А ёсць і такія, хто сам тэлефануе і прапаноўвае інспектару сустрэцца, каб нешта абмеркаваць. «Я не проста расказваю аб тым, што піва піць нельга, — заўважае старшы лейтэнант міліцыі. — Мы абмяркоўваем канкрэтныя прыклады, прыводжу сітуацыі, якія адбыліся на тэрыторыі нашага раёна. Многія дзеці давяраюць мне нешта вельмі асабістае. У мяне была дзяўчынка, якой ужо споўнілася 18 гадоў. Паведаміла ёй, што прыходзіць на ўчастак больш не трэба, але яна выказала жаданне яшчэ раз сустрэцца са мной, каб пагутарыць. Нехта успрымае нашы гутаркі для ўзбагачэння сваіх ведаў, іншыя — адразу ў штыкі, нават слухаць нічога не хочуць».

Большасць падлеткаў, у дачыненні да якіх правадзіцца індывідуальная прафілактычная работа, трапілі на кантроль правааховўнікаў за ўжыванне алкагольных напояў або за знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення, кradзяжы. Многія з іх знаходзяць на працягу года на прафілактычныя мерапрыемствы, усё зрабумеюць і наўрад ці калі яшчэ трапяць у поле зроку міліцыі. А ёсць дзеці, па якіх адразу відаць, што іх лёс складзецца няпроста. І, як паказвае практыка, пасля дасягнення 18-гадовага ўзросту з уліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх яны пераходзяць на ўлік крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

— Раней часцей парушалі закон хлопцы, цяпер — прыкладна адпольава, — адзначае ўчастковы інспектар. — Часам дзяўчаты такое «выдадуць», што нават ад хлопцаў падобнага не чакаеш. Хлопцы — гэта, як правіла, хуліганы: могуць і пабіцца, і піва папіць, і скрасці што-небудзь. Думаюць, што самыя разумныя і хітрыя, забываючы пры гэтым, што цяпер нават у самай простай краме ёсць камеры відэаназірання.

З непаўналетнім, які здзейсняе адміністрацыйнае правапарушэнне, інспекцыя правадзіць работу на працягу года. Калі падлетак стабільны, адэкватны, не прадбачыцца, што знаходзіцца ў зоне рызыкі здзяйснення паўторных правапарушэнняў або злачынстваў, ён здымаецца з уліку. Калі відаць, што здзейсненае правапарушэнне ў дзіцяці далёка не апошняе і за гэты перыяд ён яшчэ раз парушыў заканадаўства, супрацоўнікі міліцыі працягваюць з ім узаемадзейнічаць значна даўжэй.

ПРАБЛЕМЫ — З-ЗА НЕДАХОПУ ЎВАГІ

Мы каля пад'езда дома, дзе жыве сям'я, якая знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дамафон сігналізуе аб тым, што можна ўвайсці: гаспадары нават не спыталіся, што за нечаканыя госці да іх завіталі. Як расказвае Валерыя, тут выхоўваюцца тры дачкі. Маці і бацька злоўжываюць алкаголем. Цяпер у іх — апошняе папярэджанне. Іначай дзяўчат, малодшая з якіх ходзіць у дзіцячы садок, забяруць.

Нас сустракае бацька. Мужчына цвярозы. Гаспадыні дома няма: як патлумачыў муж, пайшла ўладкоўвацца на работу. Па яго словах, і ён узяўся за розум: кінуў піць і неўзабаве вернецца да работы.

— Калісьці гэта была вельмі забяспечная сям'я, якая за свае сродкі набыла чатырохпакаёвую кватэру ў Мінску, — расказвае інспектар. — Потым бізнес прагарэў, бацькі пачалі выпівацъ. У выніку ад былой раскошы амаль нічога не засталося. Цяпер карміць сям'ю вымушаны іх дарослы сын.

Вялікую ўвагу інспектар па справах непаўналетніх удзяляе і прафілактыцы наркаманіі і распаўсюджванню асабліва небяспечных рэчываў. Інспектар вядзе работу і з тымі, хто спажывае наркотыкі. Тых, хто зарабляе на гэтым грошы, на ўліку ў інспекцыі няма. Справа ў тым, што з таго моманту, калі дзяцей з наркотыкамі затрымалі, яны знаходзяцца пад вартай — дахаты іх ужо ніхто не адпусціць: крымінальная адказнасць за распаўсюджванне наркотыкаў, псіхатропных рэчываў наступае з 14-гадовага ўзросту.

— Большасць падлеткаў, якія трапляюць у поле зроку міліцыі за распаўсюджванне наркотыкаў, выхоўваецца ў прыстойных сем'ях, — падкрэслівае Валерыя Зорка. — Гэта яшчэ раз пацвярджае, што ў зоне рызыкі — не тыя сем'і, дзе бацькі п'юць, а тыя, дзе, незалежна ад дастатку і ладу жыцця дарослых, не ўдзяляецца ўвага дзецям: калі бацькі не з'яўляюцца сябрамі свайму дзіцяці, не спрабуюць унікнуць у яго праблемы, не знаёмяцца з яго атачэннем. Бываюць сітуацыі, калі дзіця сыходзіць з дома, мы пачынаем яго шукаць. Некаторыя бацькі не могуць нам дапамагчы, бо нават не ведаюць, дзе жывуць сябры ўласнага дзіцяці!

...Усяго тры візіты ў сем'і. Для мяне, чалавека, які па родзе сваёй дзейнасці таксама сустракаецца з рознымі людзьмі, — псіхалагічна няпроста, вельмі эмацыянальна. Цяжка ўсвядоміць, як такое магло адбыцца ў сем'ях, дзе раней усё было добра. Валерыя, у адрозненне ад мяне, не шукае прычыны. Яна думае, як дапамагчы гэтым людзям, у першую чаргу дзецям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Калі атрымліваецца, яшчэ раз пераконваецца ў тым, што выбрала правільную прафесію і недарэмна працягвае афіцэрскую дынастыю.

Будзьце пільныя!

Штрафная цыгарэта

Што трэба ведаць курыльшчыкам, каб не парушаць закон?

Аб шкодзе курэння для здароўя сказана ўжо неаднойчы. Урачы не перастаюць нагадваць аб сумных наступствах гэтай згубнай звычкі. Хтосьці да медыцынскай супольнасці прыслухоўваецца. Іншыя ж як курылі, так і працягваюць гэта рабіць. І добра, калі нікому не перашкаджаюць. Аднак у большасці выпадкаў ад згубнай звычкі аднаго чалавека пакутуюць яго блізкія, нярэдка — суседзі, а бывае, што і зусім старонніе людзі.

Для некаторых курыльшчыкаў іх згубная звычка выліваецца ў парушэнне заканадаўства. Сёлета выйўлена каля 1700 адміністрацыйных правапарушэнняў, звязаных з курэннем у забароненых месцах, з якіх амаль 90 здзейснена непаўналетнімі.

Парушаюць заканадаўства і тыя, хто прадае асобам, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, тытунёвыя вырабы і вадкасці для электронных сістэм курэння. Аб гэтым, нагадваюць у міліцыі, не павінны забывацца службовыя асобы і супрацоўнікі гандлёвых аб'ектаў. Падчас узнікнення спрэчнай сітуацыі прадавец мае права запатрабаваць у пакупніка дакумент, у якім указаваецца дата яго нараджэння. Калі такія дакументы не прад'яўляюцца, прадавец не павінен прадаваць тыя тавары, продаж якіх непаўналетнім асобам забаронены.

Варта адзначыць, што амаль за чатыры месяцы 2022 года за парушэнне парадку ажыццяўлення гандлю і грамадскага харчавання, аказання паслуг насельніцтву, рэалізацыі тавараў фізічнымі асобамі да адміністрацыйнай адказнасці за продаж алкагольных, слабаалкагольных напіткаў, піва, тытунёвых вырабаў, электронных сістэм курэння, вадкасцяў для іх, а таксама сістэм для ўжывання тытуню непаўналетнім прыцягнуты 124 работнікі гандлю.

— Супрацоўнікі міліцыі ў першую чаргу накіраваны на прафілактычную работу, — адзначыў **намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС падпалкоўнік міліцыі Васіль ГЕРАСІМАЎ.** — З улікам дзеючага заканадаўства тыя, хто заўважаны супрацоўнікамі міліцыі ўпершыню, пры наяўнасці падстаў могуць быць вызвалены ад адміністрацыйнай адказнасці за здзейсненне адміністрацыйнай правіннасці з вынясненнем папярэджання. Разам з тым грамадзяне павінны разумець, што, запальваючы цыгарэту на лесвічнай пляцоўцы, у ліфце, на прыпынку грамадскага транспарту або ў парку, яны прычыняюць нязручнасць і прымушаюць дыхаць дымам іншых людзей, у тым ліку пажылых, хворых або дзяцей.

Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2002 года, у цяперашні час курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, а таксама сістэм для спажывання тытуню **забараняецца:**

— у ліфтах і дапаможных памяшканнях шматкватэрных жылых дамоў, інтэрнатаў;

— на дзіцячых пляцоўках;

— на працоўных месцах, арганізаваных у памяшканнях;

— на тэрыторыях і ў памяшканнях, якія займаюць спартыўна-аздараўленчыя і іншыя лагеры;

— у памяшканнях і на тэрыторыях, што займаюць установы адукацыі, арганізацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы пасляўніверсітэцкай адукацыі;

— у падземных пераходах, на станцыях метрапалітэна;

— на прыпыначных пунктах на маршрутах аўтамабільных перавозак пасажыраў і перавозак пасажыраў гарадскім электрычным транспартам, пасадачных пляцоўках, якія выкарыстоўваюцца для пасадкі і высадкі пасажыраў;

— у аўтамабілях, калі ў іх прысутнічаюць дзеці ва ўзросце да 14 гадоў.

Таксама нельга курыць, у тым ліку выкарыстоўваць электронныя сістэмы курэння і сістэмы для спажывання тытуню, за выключэннем спецыяльна створаных для гэтых мэт месцах:

— у гандлёвых аб'ектах і аб'ектах бытавога абслугоўвання насельніцтва, гандлёвых цэнтрах і рынках;

— у аб'ектах грамадскага харчавання, на тэрыторыі летніх пляцовак;

— у межах тэрыторый, занятых пляжамі;

— на тэрыторыях і ў памяшканнях, якія займаюць арганізацыі фізічнай культуры і спорту, фізкультурна-спартыўныя збудаванні;

— у выторчых будынках (памяшканнях);

— у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюць дзяржаўныя органы, арганізацыі культуры і аховы здароўя, санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі, а таксама арганізацыі, якія аказваюць паслугі сувязі, сацыяльныя, банкаўскія, страхавыя, гасцінічныя і іншыя паслугі, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якім, у адпаведнасці з заканадаўствам, дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

— у памяшканнях, прызначаных для прыёму грамадзян, у тым ліку па пытаннях ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур;

— у памяшканнях пасажырскіх тэрміналаў аўтамабільнага транспарту, партоў і аэрапортаў;

— у памяшканнях і на тэрыторыях чыгуначных станцый, прызначаных для абслугоўвання пасажыраў чыгуначнага транспарту агульнага карыстання.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

Слова пісьменніка

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

РЭКТАР-НАСТАЎНІК

А яшчэ музыка і харэаграфія! Падрыхтоўку настаўнікаў гэтага профілю для сярэдніх школ рэктару прапанавалі ўжо мясцовыя ўніверсітэцкія энтузіясты. У інстытуце заўсёды была кафедра музыкі. Яна забяспечвала неабходнымі музычнымі навыкамі будучых настаўнікаў пачатковых класаў і выхавальнікаў дзіцячых садкоў. Загадвае гэтай кафедрай А. А. Дабродзька, дарэчы, блізкі сябар Кудрашова. Менавіта Анатоль Аляксеевіч сабраў у сябе на кафедры выдатных музыкантаў, і яны, адчуўшы свою прафесійную сілу, прыйшлі да рэктара з прапановай адкрыць спецыяльнасць настаўніка музыкі і спевaў. Але тады была ўстаноўка для школ рыхтаваць настаўнікаў на здвоеных, памежных спецыяльнасцях: фізіка і матэматыка, хімія і біялогія, ваенная справа і фізкультура. Кафедра прапануе сумясціць музыку і... харэаграфію! Усім, у тым ліку і рэктару, было зразумела, як гэта няпроста. І тым, і другім трэба займацца з дзяцінства, сістэматычна. Адначасова гэта рабіць цяжка, да таго ж патрэбна ўлічваць, што да музыкі і танцаў патрэбны прыродныя здольнасці і далёка не заўсёды яны сумяшчальныя. Але рэктар падтрымаў гэтыя прапановы. І нам давялося наладжваць люстэркавыя залы для заняткаў па харэаграфіі, пераабсталёўваць вучобныя кабінеты пад боксы для індывідуальных заняткаў па музыцы, набываць вельмі нятанныя музычныя інструменты і касцюмы для танцавальных кампазіцый. Як прарэктар, я вёў гэты факультэт і непасрэдна ведаў гэтыя праблемы. Напрыклад, прыходзіць да мяне дацэнт П. П. Забелаў, прафесійны музыкант-баяніст, кіраўнік аркестра народных інструментаў, і кажа:

— Аляксандр Міхайлавіч, нам патрэбны канцэртны баян!

Я ведаў, што ён прыйдзе з гэтым пытанням, падрыхтаваўся. Пытаюся:

— Пётр Пятровіч, а колькі ён каштуе?

— Пяць тысяч долараў.

— А Анатоль Ціханавіч Глаз, наменскіх старшыні аблвыканкама, мне сказаў, што для філармоніі ён купіў канцэртны баян за паўтары тысячы долараў.

— За паўтары тысячы долараў — гэта скрыня! А нам патрэбны канцэртны баян!

А яшчэ рааль, піяніна, струнныя, духавыя... І рэктар па магчымасці вырашаў гэтыя пытанні, хоць у той самы час патрэбна было закупляць у вялікіх аб'ёмах вылічальную тэхніку, якая патрабавала абнаўлення ледзьве не два разы на год. Але не гэтыя праблемы з музыкай і харэаграфіяй непакоілі Кудрашова болей, чым самі выкладчыкі дадзеных профіляў. Гэта ж людзі сцэны, артысты, творчыя і нестандартныя асобы. Калі, напрыклад, матэматык будзе гадамі думаць, ці правільна ён разумее тую ці іншую тэорыю, то музыкант, вакаліст, харэограф у першую чаргу ўпэўнены, што ён лепшы за ўсіх на свеце творца, а нам усім не дадзена гэта нават зразумець. Адночы Яўген Паўлавіч накіраваў мяне на пасяджэнне кафедры фартэпіяна і харавога дырыжыравання разбіраюцца з канфліктам, які там распаліўся не на жарт: чый хор лепшы. Ні дэкан, ні загадчык кафедры выпадкова гэтую спрэчку былі ўжо не ў сілах. Мы з рэктарам прадумалі нашу пазіцыю, і я адразу калегам сказаў:

— Пакуль я ішоў да вас па пасяджэнне кафедры, пакутліва прыгадваў, калі ж я наведваў кафедру тэарэтычнай фізікі? І з жахам прыгадаў, што ніколі ў іх не быў! А яны свайму навуковаму працамі зраблі наш інстытут вядомым ва ўсім свеце: друкуюцца ў самых прэстыжных замежных часопісах. А вы наладзілі бойку, каб высветліць, чый курсавы хор лепшы, а агульнаўніверсітэцкі хор стварыць не можаце!

Падзэмічнала! Болей гэтых спрэчак на ўзровень рэктарата кафедра не выносіла. І такіх момантаў было дастаткова. Думаю, Кудрашоў іх прадбачыў і ўсё адно на такое развіццё інстытута пайшоў. І ізноў меў рацыю! Музыканты прыўнеслі ў наш калектыў культуру самага высокага ўзроўню. Уяўляеце, адночы яны нам прэзентавалі канцэрт Рахманінава, у два раялі, за якімі былі брат і сястра Пятровы-Кумінскія, з прафесійным студэнцкім хорам, якім дырыжыравў С. Ю. Лішчанка. А вакальны ансамбль «Гармонія», якім кіравў дацэнт Валянцін Паўлавіч Рэва, ведалі і любілі слухаць на ўсіх прасторах нашай краіны. Адночы мне пра гэты калектыў расказваў рэктар БДПУ імя М. Танка Пётр Дзмітрыевіч Кухарчык:

* Іду па другім паверсе свайго ўніверсітэта і бачу натоўп каля актавай залы. Дзверы там адчынены, усе ахвотныя зайсці не змаглі і слухаюць канцэрт нават у калідоры. І я спыніўся, прыслухаўся і таксама застаўся стаяць. З залы лілося акапэльнае гучанне песні — так гарманічна, так пяшчотна, што адарвацца ад гэтай музыкі было немагчыма. Ціха пытаюся: «Хто выступае?» Мне кажуць: «Гармонія» Магілёўскага ўніверсітэта.

А Пятру Дзмітрыевічу і яго калегам было з чым параўнаць. У яго меўся свой музычна-педагагічны факультэт з выдатнымі выкладчыкамі, якія падрыхтавалі класных, вядомых выканаўцаў, такіх, напрыклад, як Алёна Свірыдава.

Музычна-педагагічную культуру ў інстытуце фарміравалі В. Рэва і П. П. Забелаў, вакальную школу — Людміла Браілоўская, харэаграфічную — Георгій Квасцянкі, харавую — Сяргей Лішчанка. Яны сабралі вакол сябе выдатных музыкантаў, педагогаў, якія былі здольны творча думаць. Інстытут набыў новыя прывабныя адценні, стаў прыкметным у культурным асяроддзі, узбагаціў і разнастаіў свой кадравы патэнцыял. Улэўнены, Кудрашоў, рызыкуючы з адкрыццём такіх спецыяльнасцяў, разлічваў на гэта. І не памыліўся!

На час рэктарства Кудрашова прыйшлася і інфарматызацыя нашага жыцця. Калькулятары, ЭВМ, персанальныя камп'ютары імкліва ўварваліся ў вучобны працэс, запатрабавалі яго карднальнай перабудовы, перападрыхтоўкі ўсяго выкладчыцкага корпуса. Грамадства запатрабавала настаўнікаў новай фармацыі. Зразумела, што на чале працэсаў засваення інфармацыйных тэхналогій трэба было ставіць фізіка-матэматычны факультэт. А ён па тым часе быў найлепшым у інстытуце і вядомым ва ўсім СССР. Але хто канкрэтна павінен узначаліць засваенне гэтых тэхналогій? І тут Яўген Паўлавіч не памыліўся: ён даручыў гэта кафедры матэматычнага аналізу і канкрэтна яе загадчыку — дацэнту Мікалаю Парфір'евічу Марозаву. Былі на фізмаце кафедры тэарэтычнай фізікі, алгебры і геаметрыі, агульнай фізікі, методыкі выкладання матэматыкі са знакамітым на ўвесь свет прафесарам А. А. Столярам. Ім таксама можна было даручыць гэтую справу. Але выкладчыкі кафедры матэматычнага аналізу пыкметна адрозніваліся ад сваіх калег гранічнай адказнасцю, скрупулёзнасцю ў працы, выключнай строгасцю і высокім прафесіяналізмам. А Мікалай Парфір'евіч адкрыта акумуляваў у сабе гэтыя якасці. Вось са сваім калектывам ён і зацягнуў нас усіх у новы віртуальны свет, у прыгажосць, прывабнасць і эфектыўнасць лічбавых тэхналогій.

Рэктар ВНУ па вызначэнні палітык. Ён адказвае за працэс падрыхтоўкі злітых грамадства, кіраўнікоў і натхняльнікаў калектываў працоўных, ад невялікай школы ці вытворчага цэха да буйнага прадпрыемства, галіны, міністэрства. Ён — дзяржаўны чалавек і павінен адпавядаць дзяржаўнай палітыцы. Зразумела, што кіраўнік універсітэта — гэта перш-наперш прафесіянал у арганізацыі навукова-педагагічнага працэсу, але функцыянаванне ВНУ вызначае агульная дзяржаўная палітыка — і рэктар з'яўляецца яе прадстаўніком. Яўген Паўлавіч быў членам КПСС, і я ніколі не чуў яго сумненняў у правільнасці і непахіснасці марксісцка-ленінскай ідэалогіі і курса партыі. Нават калі пачаў разбурацца Савецкі Саюз з усімі звыклымі для нас устоямі. Ён цярпліва ўспрымаў новыя павевы, разгул дэмакратыі, ідэалогію БНФ, абмяркоўваў з калегамі развіццё ўніверсітэта ў гэтых умовах, але ніколі не падвяргаў сумненням савецкае мінулае. На крайні выпадак, на людзях і ва ўніверсітэце. Ды і не мог ён весці сябе іначай. Камуністычная партыя прызнавала яго заслугі, ён нават выбіраўся членам бюро абласнога камітэта. Гэта па тым часе было вялікім гонарам.

У 1994 годзе, калі ў краіне ўпершыню абвяшчылі выбары Прэзідэнта, Кудрашоў арыентаваў даручаны яму калектыў на падтрымку кандыдатуры В. Ф. Кебіча. Ён і не мог весці сябе іначай. Рэктар непасрэдна ўбудаваны ў намінклатурную сістэму і не мае права весці сябе інакш. А Яўген Паўлавіч быў выхаваны савецкай адміністрацыйнай сістэмай і паступаў так заўсёды. Але кандыдатам у Прэзідэнты выпучыў свою кандыдатуру выпускнік гістарычнага факультэта Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, таго факультэта, дзе некалі дэканам быў Кудрашоў. Аляксандр Рыгоравіч прыехаў у час выбарчай кампаніі ў інстытут, каб сустрэцца з выкладчыкамі і студэнтамі. Мала таго, рэктар не пярэчыў супраць гэтай сустрэчы, ён сам суправаджаў маладога кандыдата ў Прэзідэнты і на сходзе калектыву відавочна не хаваў сваіх сімпатый да яго. Болей за тое, адобрыў стварэнне групы падтрымкі Аляксандра Рыгоравіча з ліку яго інстытуцкіх сяброў, маладых выкладчыкаў. Неабходнае палітычнае прадчуванне ў Кудрашова не прытупілася нават наймагутнейшай савецкай бюракратычнай сістэмай.

Рэктар ВНУ, несумненна, павінен быць вучоным. Яўген Паўлавіч даследаваў заканамернасці развіцця палітэканоміі сацыялізму. Абараніў на гэтай праблематыцы кандыдацкую дысертацыю, атрымаў вучонае званне дацэнта і адразу стаў падымацца па службовай лесвіцы: дэкан, рэктар. Не сумняваюся, што ў яго ўсё атрымалася б і на навуковай ніве. Я слухаў яго лекцыі, бачыў непасрэдную здольнасць думаць сістэмна і часта нават арыгінальна, адчуваў у ім высокую культуру не толькі выкладчыка ВНУ, але і таленавітага вучонага. Але ён цалкам прысвяціў сябе вельмі няпростай справе кіраўніцтва, развіцця інстытута. У гэтым дасягнуў поспеху, але навуковай працай ужо сістэмна не займаўся, над доктарскай дысертацыяй не працаваў і нават пра гэта не гаварыў. Іншым абараняцца не перашкаджаў. Больш за тое, абарону кандыдацкіх дысертацый стымуляваў як маральна, так і матэрыяльна. Пасля прызначэння рэктарам Кудрашоў стаў рашуча замяняць загадчыкаў кафедр і дэканаў без ступеняў на кандыдатаў навук. Мы ўсе, прыйшоўшы ў інстытут маладымі выкладчыкамі, ведалі, што пасля абароны рэктар на працягу года выдзеліць кватэру. Ну, не так літаральна, але ўсё ж такі Кудрашоў сваё слова стараўся трымаць. І гэта выклікала павагу. Аднак працы над доктарскімі дысертацыямі ён настойліва ні ад кога не патрабаваў і адкрытага захаплення з нагоды іх абароны не выяўляў. Гэтаму працэсу не перашкаджаў, але і яўна яго не стымулявaў. У тыя часіны і абарон такіх былі адзінкі, доктарская ступень у перыферыйных ВНУ — даволі вялікая рэдкасць. У нас іх тады было толькі дзве: па методыцы выкладання матэматыкі А. А. Столяра і па філасофіі І. І. Сяровай. І калі прафесар Столяр здолеў стварыць навукову школу сусветнага ўзроўню, то Ірына Іванаўна як вучоны была прыкметнай і вядомай, але такой маштабнай школы ў яе не атрымалася. Назіраючы і аналізуючы працу рэктара Кудрашова, а пасля і яго пераемніка М. А. Аўласевіча, я для сябе зрабіў выснову, што рэктар абавязаны быць дактарам навук. Яму самому варта прайсці гэты этап станаўлення вучонага: знайсці перспектыўную тэму, арганізавать на ёй даследаванні, надрукаваць і абмеркаваць з калегамі атрыманыя рэзультаты і дакazаць іх вартасць, абараніць доктарскую дысертацыю, захапіць свaімі росшукамі маладых вучоных, сфарміраваць сваю навуковую школу... Іначай як патрабаваць ад падначаленых табе выкладчыкаў неабходнай ва ўніверсітэце навуковай працы? У выпадку адсутнасці такіх асабістых рэзультатаў ты будзеш не вельмі пераканаўчы. Ужо на пасадзе міністра адукацыі я стараўся ў прызначэнні рэктараў няўхільна прытрымлівацца гэтай пазіцыі.

У той самы час Яўген Паўлавіч імкнуўся навуковую працу ў інстытуце арганізавать на вартым узроўні, перш за ўсё праз сваіх намеснікаў. Напрыклад, на новую, толькі што ўведзеную пасаду прарэктара па навуковай рабоце ён прызначыў таго ж прафесара А. А. Столяра, хоць мы ўсе бачылі, што ў вялікіх сябрах яны не былі. А пасля ад'ездy Абрама Аронавіча ў Маскву Кудрашоў прапанаваў гэтую пасаду маладому дактару біялагічных навук М. В. Машчанку, хоць мы ўсе чакалі прызначэння дэкана фізіка-матэматычнага факультэта Я. Я. Сянько, ведаючы, што якраз з ім у Яўгена Паўлавіча былі сяброўскія адносіны.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 30 красавіка).

(Пачатак у нумарах за 26 сакавіка, 2, 9, 16 красавіка).

Асабістае

«ДА» І «ПАСЛЯ» ЦУДУ

Размова з сяброўкай дзяцінства пра каштоўнасць жыцця

З-за фіранкі лашчылася свята, слізганула па падушцы, імкнучыся знайсці твар і зазірнуць у вочы: ну, ці ведаеш, навошта табе гэты дзень? Кожная новая раніца багатая на навіны, самыя розныя. Але кожную з іх сустракаю з асаблівa вострым адчуваннем жыцця. Бывае так, што яно падзяляецца на «да» і «пасля» — ці то ў асобных людзей, ці то ў сем'яў і так далей. У сваім «да» я не разумела, што «пасля» буду з удзячнасцю радавацца драбніцам, якія ўмацоўваюць перакананне: сэнс жыцця — найперш у самім жыцці.

— ... Ай, жыць не хочацца, — махнула рукой сяброўка дзяцінства, якую я не бачыла больш за дзесяць гадоў. Пайшла па прадукты для бацькоў, а Святлана рушыла насустрач — ужо затарылася тым, што было неабходна ёй, каб заахвоціцца да жыцця. Спрабую яе падтрымаць: сапрайды, няпроста, столькі ўсяго адбываецца навокал, у кожнага свае стрэсы.

— Душа гарыць... — спрабавала апраўдацца яна ці то перада мной, ці то перад хлопчыкам, які стаяў побач з ёй і трымаў торбу.

Мы выраслі ў адным дварэ, нашы бацькі працавалі ў адной арганізацыі, мамы сябравалі ды па-суседску спакойна адчынялі дзверы з кватэры ў кватэру, калі была неабходнасць душэўных размоў. У нашым утульным дворыку мы гулялі ў хованкі. Пазней — у цікіх кутках пад пах вясноваго бэзу ахвотна абмяркоўвалі прачытаныя кнігі: мне катэгарычна не падабалася Наташа Растова, і я шкадавала няўклюду П'ера Бязухава, а Света захапляласа героямі, такімі як Андрэй Балконскі, але апраўдава яго нявесту, бо кожны чалавек мае права адчуваць сябе шчаслівым. Мы абедзьве марылі пра шчасце і разумелі, што дзеля яго трэба вучыцца далей. Мне больш пашчасціла. А Святлане пасля школы маці «арганізавала» жаніха — хутка і дзіўна для ўсіх. А праз колькі месяцаў мае бацькі дапамаглі пахаваць яе маці. Пасля — пахавалі і яе бацьку. Усе ў дварэ зразумелі, нашто было тое хуткае замужжа: каб Света не засталася адна. Муж — просты хлопец, «без пантоў». Не пра такога марыла дзяўчына. Яна марыла не столькі пра мужа, колькі пра каханне. Таму пайшла шукаць яго, як толькі нарадзіла дзяўчынку. Быў складаны развод, на дачку прэтэндаваў муж, але сваю Сонечку (названую ў гонар мамы) яна адстаяла. Без тэтак дзяўчынкі ёй было б складана, бо, фактычна, яна дапамагла гадаваць сястрычку, якую Святлана нарадзіла, а потым вельмі хутка расчаравалася ў сваім каханым. Усё змянілася, калі яна зноў выйшла замуж. Нарадзіўся Ромка, якому цяпер дванаццаць гадоў.

— ...А ён усё перакрэсліў. Жыццё спынілася... — і яна расплюшчыла, як ужо спрабавала вырашыць праблему ўласнага жыцця. Дзеці ўратавалі, а цяпер паўсюль кантралююць. — Але ты не зразумееш...

Так, у мяне няма траіх дзяцей, якія утрымлівалі б у жыцці. Але я не разумею, як можна не думаць пра іх, пра тых, хто побач і залежыць ад цябе. Жыць, калі ёсць дзеля каго, — матывацыя больш істотная ў любых варунках, чым неабходнасць выжыць у сітуацыі, калі гэта здаецца наогул немагчымым. Але разумею, што ў кожнага з нас свая барацьба за жыццё, часам адкрытая і прынцыповая, а часам ціхая, зусім невідавочная. Дакладна ведаю: само жыццё нам працягвае трысцінку, за якую можна ўхапіцца і выбрацца з багны. Чалавек здольны выкарыстаць з найскладанейшых сітуацый, нават калі здаецца, што ўсё супраць яго. Бо асабліва адчуваем каштоўнасць жыцця, калі менавіта тыды, калі яму ёсць рэальная пагроза... Света крыва ўсміхнулася, прытым, што па характары была жыццялюбкай, у той час як я зайсцёды была схільная да іпахондрыі. Але мы сябе не надта добра ведаем.

...Адночы я адчула, што са мной адбываецца нешта не тое. Пайшла да ўрачоў, але ніхто нічога небяспечнага не бачыў. Прайшло паўгода настойлівых паходаў па медыцынскіх установах, перш чым пацвердзіўся самы жахлівы дыягназ: рак. Магчыма, за паўгода ўжо мінуў час, калі б я злякалася гэтага слова. Было роўна наадварот: нейкая палёгка, бо нарэшце ўсё высветлілася, і я цяпер ведаю, з чым давядзецца змагацца. Больш трывожным быў стан нявызначанасці. А калі разумееш, што ёсць праблема (інакш я гэта імкнулася не называць), то шукаеш спосабы яе ліквідаваць як мага больш эфектыўна — і знойдзеш тых, хто табе ў гэтым дапаможа. Абцяжарвала хіба што адна акалічнасць: у сваім змаганні я аказалася зусім адна. Сястра з сям'ёй далека, а бацькі ўжо немаладыя, лепш было ім нічога не казаць — яны нервавалася б, я перажывала б з-за іх, гэта толькі падрывала б сілы. Цяжка растлумачыць, што дапамагло не скласці рукі, не расклеіцца, не напалохаць бацькоў. Магчыма, вера ў спагаду няёбсаў, у рукаў якіх апынуўся мой лёс: як трэба, так і будзе. Заставалася зразумець: які ва ўсім гэтым сэнс?

За некалькі гадоў да таго ў маёй свядомасці адбыўся злом: што магла, я ўжо зрабіла, існую нібыта на аўтапілоце. Знік азарт жыцця. І вось яно перастала быць млосным: не, будзе так, як трэба мне, нават калі напарадзе няпросты і далёкі шлях. У кожным з нас насамрэч нашмат больш сілы і рэсурсу, чым здаецца. Нашы рэзервы бяздонныя і могуць пастаянна папаўняцца. Крыніцы сілкавання бываюць розныя.

Першая крыніца ў маім выпадку — катэгарычная ўнутраная нязгода з тым, што гэта прысуд. Як і любая хвароба, гэтая мова была пераможана. Гэта дыягназ, з якім у сучасным свеце навучыліся змагацца. «Усё будзе добра, таму што своечасова», — сказала я сабе. І першае, што зрабіла: выключыла любую мітусню, якая перашкаджала б лавіць радасць жыцця. Кожнае імгненне набыло важкасць.

Сонца за акном пераконвала: вось жыццё, цані яго нават самую малую пяшчоту. Крок, яшчэ крок — так прыемна адчуваць пад нагамі жывую зямлю. Нязвай пасля снегу яна недзе вільготная, няхай не такая цёплая, як хацелася б адчуваць яе вясной. Але штуркі ветру ў спіну імкнуліся збіць з ног, не дазвалялюбы наталіцца радасцю ад ўласных крокаў па сакавіцкім святле. Зноў штуршок — прыспешыла хаду, каб збегчы ад трывогі, навязанай звонку. У тую вясну здарылася сітуацыя з каранавірусам. «Як вы несвоечасова...» — заўважвала лекарка, разглядаючы мае паперы. І як бы між іншым: аперацыю зрабіць ужо не змогуць. Першую стадыю раптам пераквалiфікавалі ў III В. Ды ну, не...

Бываюць моманты, калі немагчыма не думаць пра тое, што і так абавязкова здарыцца, — мы да гэтага ідзём, як толькі нараджаемся. А смерць — натуральны працяг жыцця. Падчысцілa справы, склала і аформіла завяшчанне, упісаўшы туды ўсіх, каго любіла. І бацькоў... Як можна дапусціць, каб ім давялося хаваць дзіця? Паспрабавала гэта ўявіць — і не змагла. Бо гэта ненатуральна... Чарговы штуршок вятру ў спіну ледзь не збіў з ног. Што? Чаму я павінна табе падпарадкоўвацца, я ж не ветразь?!.. Ступаю па зямлі сваімі нагамі, а гэта значыць, мару ламаць маршрут, мару павярнуца і пайсці ў адваротны бок, калі вецер у твар. «Жыць!» — сказала я сабе наступнай раніцай чарговаму доктару, які павінен быў даць надзею, але адводзіў позірк...

Сястра знайшла хірурга за мяжой, які ўзяўся зрабіць аперацыю. А тут якраз закрылі граніцы на карантын, немагчыма было выехаць, каб не марнаваць такі дарагі час — пухліна была агрэсіўная. У такіх сітуацыях кожны дзень адсутнасці змагання здаецца асобным паражэннем на полі бітвы і недаравальнай стратай. Узнятыя ўсе кантакты, ніхто не можа дапамагчы з выездам. Калі ўсе варыянты былі вычарпаныя і застаўся адзін — прыняць план лячэння, які прапанавалі дома, — наступіў спакой. Прынялі сітуацыі — гэта не адступленне. Проста лінія фронту мяняе абрысы.

Тады ўключылася яшчэ адна крыніца — дараванне. Я не думала, што мяне гэта датычыцца, таму што даўно ведала пра боскія запаветы. Але так бывае, што нейкія дробныя крыўды ды непаразуменні, «непаратраўленыя» своечасова, затаюцца на доўгі сэрца. Такая дрэнь, што калі тлее нават маленечкі ачаг, атрутныя рэчывы так ці інакш распаўсюдзваюцца па целе. Цяпер, застаўшыся сам-насам, разумеючы складанасць лячэння, якое прапанавалі нашы ўрачы, я пільна перагледзела ўсю сябе, вызваляючы кожную клетку свайго цела ад рознага роду шалупіння — каб не было лішняга цяжару. Памяць падкідвала карцінкі з «мірнага» жыцця — арганізм падказваў сам, каму патэлефанаваць, з кім сустрэцца. І тое, што здавалася складаным і нерэальным, цяпер склалася проста і натуральна — неабходнасць размаўляць і сустракацца. Цені з мінулага жыцця матэрыялізаваліся — і аказаліся людзьмі, якія радыя таму, што я ёсць.

Калі разумееш, наколькі нетрывалае жыццё, то ў людзях, падзеях, з'явах лепш бачыш іх сутнасць, значнасць для твайго лёсу. І аказваецца, што ён зусім не проста так стварыў табе гэтую праблему: яна дапамагла вырашыць асабістыя сітуацыі, якія гадамі здаваліся невырашальнымі. Таму што кожны з нас прыходзіць у свет, каб навучыцца любіць людзей — так проста, але няма нічога больш складанага...

Як жа дзіўна працуе гэтая мудрасць! Ты проста робіш крок насустрач людзям, з якімі былі непаразуменні, — і неяк нябачна пачынае мяняцца твая сітуацыя. Людзі — блізкія і далёкія, якія зноў сталі блізкімі, — дапамаглі набыць сілы і прапільна іх размеркаваць.

На чарговы прыем я ішла з пачуццём палёгкі і адчувала, што не адна. Быў сонечны дзень, свята Дабравешчання прасвятой Багародзіцы. І быў суд! Добрая вестка: урач, замест таго, каб прызначыць апраменьванне па радыкальнай праграме, сабрала кансіліум. Калі я была маральна гатовая да любога развіцця, неспадзявана ўсё ж прапанавалі аперацыю — яна значна павышала шанцы на добры вынік... Са мной была галоўная крыніца сілы! «Не бойцеся» — вельмі дзёсны хрысціянскі наказ. Чаго можа баяцца чалавек, які верыць у бессмяротнасць, адпаведна, і нязломнасць душы?

